Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

29 ЖНІЎНЯ 2009 г. СУБОТА № 162 (26520)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## «РТР-Беларусь» пакажа інтэрв'ю Аляксандра Лукашэнкі тэлепраграме «Формула ўлады» 29 жніўня і 1 верасня

**Тэлеканал «РТР-Беларусь» пакажа інтэрв'ю Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі тэлепраграме «Формула ўлады» 29 жніўня і 1 верасня, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА на тэлеканале.**

У суботу, 29 жніўня, тэлегледачы змогуць убачыць інтэрв'ю ў 19.20, а ў аўторак, 1 верасня, паўторны паказ пачнецца ў 19.30.

«Формула ўлады» — сумесны праект расійскага інфармацыйнага агенцтва ІТАР-ТАСС і тэлеканала «Расія». Перадача выходзіць у эфір з 2000 года. За гэты час было створана больш як 150 праграм, сярод якіх тэлепартрэты прэзідэнтаў ЗША Джорджа Буша і Барака Абамы, федэральных канцлераў Германіі Герхарда Шродэра і Ангелы Меркель, прэзідэнта Францыі Жака Шырака, караля Швецыі Карла XVI Густава, караля Іспаніі Хуана Карласа, каралевы Даніі Маргрэтэ II, прэм'ер-міністра Італіі Сільвіо Берлусконі, амаль усіх кіраўнікоў краін СНД і іншых лідараў дзяржаў. Інтэрв'ю героям тэлепраграмы ў тэкставым варыянце, як правіла, публікуецца ў «Российской газете» і газеце «Известия», а таксама ў часопісах «Огонек» і «Эхо планеты».

Пастаянным аўтарам і вядучым праграмы «Формула ўлады» з'яўляецца першы намеснік генеральнага дырэктара ІТАР-ТАСС Міхаіл Гусман.

## Прэферэнцыі ІП-экспарцёрам плануецца прадаставіць у Беларусі

**У Беларусі плануецца стварыць умовы для актывізацыі экспартнай дзейнасці індывідуальных прадпрымальнікаў. З гэтай мэтай распрацаваны праект указа, што прадугледжвае прэферэнцыі для ІП, якія рэалізуюць за мяжой беларускія тавары, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе Мінэканомікі.**

Пытанне прыцягнення прадпрымальнікаў да рэалізацыі айчынных тавараў на знешніх і ўнутраным рынках абмяркоўвалася на праведзеным у Мінэканомікі чарговым пасяджэнні рабочай групы па падрыхтоўцы прапаноў для вырашэння праблемных пытанняў дзейнасці ІП і прыватных унітарных прадпрыемстваў.

У ходзе пасяджэння прадстаўнікі бізнес-саюзаў (Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і работадаўцаў і Бізнэс-саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя прафесара М.С. Куняўскага) выказалі шэраг прапаноў, звязаных з набыццём ІП у прадпрыемстваў-вытворцаў тавараў для рэалізацыі на знешніх і ўнутраным рынках. У тым ліку прапануецца выключыць нормы аб адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне парадку складання (афармлення) першасных уліковых дакументаў і называнне ў іх недакладнай інфармацыі. Бізнэс-саюзы таксама прапануюць устанавіць выключэнні для ІП, якія экспартуюць айчынныя тавары, адносна забароны прыцягваць да сваёй дзейнасці фізасобаў, якія не з'яўляюцца членамі сям'і і блізкімі сваякамі. Прапануецца дазволіць ІП прыцягваць аднаго наёмнага работніка.

Было ўзнята пытанне неабходнасці стварэння пастаяннa дзеючай аптовай выставы-кірмашу з удзелам прадпрыемстваў Мінпрама, канцэрнаў «Беллегпрам», «Белдзяржхарчпрам», «Беллесбумпрам», на якой павінна быць прадстаўлена шырокае кола тавараў ад прадпрыемстваў-вытворцаў з усіх рэгіёнаў рэспублікі.

Таксама разглядана пытанне аб прынятых аблвыканкамамі рашэннях па рэалізацыі піва і слабаалкагольных напіткаў, аб рабоце гандлёвых аб'ектаў пасля ўвядзення забароны на рэалізацыю піва і слабаалкагольных напіткаў з аб'ёмнай доляй этылавага спірту не больш як 7 працэнтаў у гандлёвых аб'ектах, размешчаных на прыпынках грамадскага транспарту. Як адзначылі ў Мінэканомікі, прадстаўнікі дзяржорганаў далі прадпрымальнікам неабходныя тлумачэнні. Пытанні, якія патрабуюць аператыўнага прыняцця мераў, будуць дадаткова прапрацаваны для далейшага ўнясення на разгляд ва ўрад.

## МВФ лічыць мэтазгодным адкласці павышэнне заработнай платы ў дзяржаўным сектары Беларусі

**МВФ лічыць неабходным перайсці ў Беларусі на больш гібкую сістэму курсаўтварэння. Аб гэтым гаворыцца ў заключнай заяве місіі МВФ, якая ў канцы жніўня праводзіла ў Беларусі кансультацыі па Артыкуле IV, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Узровень абменнага курсу і рэжым курсаўтварэння ўяўляюцца адэкватнымі, аднак у далейшым спатрэбіцца перайсці да больш гібкай сістэмы. Цяпер дзеючая прывязка курсу да карзіны валют пры гібкім яго ваганні вакол цэнтральнага парытэту забяспечвае найлепшыя перспектывы захавання знешняй стабільнасці.

**МВФ рэкамендуе Нацыянальнаму банку Беларусі ў бліжэйшы час зрабіць больш жорсткай крэдытную палітыку.**

На думку экспертаў фонду, улічваючы, што ўзровень працэнтных ставак ужо высокі, трэба ўвесці строгія абмежаванні на крэдытаванне ў рамках дзяржаўных праграм. Таксама важна ўзмацніць аперацыйную незалежнасць Нацбанка шляхам змянення заканадаўства.

**МВФ лічыць мэтазгодным адкласці павышэнне заработнай платы ў дзяржаўным сектары Беларусі пры адначасовым прадастаўленні адраснай сацыяльнай дапамогі для абароны найбольш бедных слаёў насельніцтва ад наступстваў крызісу.**

У той жа час тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі трэба наблізіць да ўзроўню кампенсацыі затратаў, а рэформу сістэмы сацыяльнай абароны трэба завяршыць. Забеспячэнне сацыяльнай абароны можа садзейнічаць скарачэнню негатыўных наступстваў і захаванню падтрымкі структурных рэформаў з боку грамадскасці.

*Да Дня беларускага пісьменства*

## «Не пакідайце мовы беларускай..!»

**З 1 па 8 верасня ў Оршы пройдзе акцыя, прымеркаваная да Дня беларускага пісьменства, назву якой далі знакамітыя словы Францішка Багушэвіча «Не пакідайце мовы беларускай, каб не ўмёрлі!». Яе арганізатарамі сталі аддзел культуры Аршанскага гарвыканкама, Музейны комплекс гісторыі і культуры Аршаншчыны. Ініцыятыву падтрымаў гарадскі аддзел адукацыі.**

— Ідэя правядзення акцыі ўзнікла ў нас з нагоды заклапочанасці тым, што на пачатку гэтага года беларуская мова трапіла ў атлас ЮНЕСКА «Мовы свету ў небяспецы», — расказала «Звяздзе» **начальнік аддзела культуры Аршанскага гарвыканкама Ірына МІГАЛЬ.** — Рыхтуючыся да Дня пісьменства, вырашылі не абыходзіцца традыцыйнымі ў такім выпадку выставамі кніг ці проста сустрэчамі, а зрабіць жывыя, запамінальныя святы, а галоўнае — даць штуршок да вывучэння мовы, да карыстання ёй. Таму ўсе нашы мерапрыемствы маюць найбольшую скіраванасць на моладзь, на школьнікаў. А ўвогуле хочам прыцягнуць увагу шырокай грамадскасці да стану беларускай мовы.

Будуць літаратурныя гасцёўні, сустрэчы з пісьменнікамі, мясцовымі і сталічнымі, музейныя святы і тэматычныя экскурсіі, прыедуць спецыялісты ў галіне мовазнаўства. Кульмінацыяй тыдня стане 4 верасня, калі пройдуць літаратурныя чытанні ля помніка Уладзіміру Караткевічу і свята беларускай песні ў амфітэатры ў Дзіцячым парку. Дзень завершыцца пастаноўкай Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа «Пазычанае шчасце» па п'есе Фёдара Палачаніна ў Гарадскім цэнтры культуры.

— Мы запрашаем да ўдзелу ў нашай акцыі ўсіх, каму неабыякавыя родная мова і родная культура, — кажа Ірына Мігаль. — На працягу акцыі будзем асабліва вітаць усіх, хто размаўляе па-беларуску. У Оршы прайшло адно з першых святаў пісьменства, спадзяёмся, што яно вернецца да нас.

**Ул. інф.**

## КАЛОДЗЕЖ У КАПЛІЦЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мінскія дзеці набіраюць ваду з калодзежа, над якім узведзена капліца. Насамрэч гэта крыніца, вядомая з сярэдзіны XIX стагоддзя як Прошча за вёскай Карытнае Асіповіцкага раёна. Да нашых дзён дайшла легенда, што два невідушчыя старцы дзякуючы вадзе наноў набылі зрок. Нездарма месца называюць таксама «Жываносная крыніцай». Цікавае яно яшчэ і тым, што гэты калодзеж цяпер трымаюць на замку.

# СПАД ПРАМЫСЛОВАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ ЗАПАВОЛЬВАЕЦЦА

**— Вынікі працы прамысловасці за апошнія сем месяцаў, з аднаго боку, сведчаць пра наяўнасць праблем, але з іншага боку сітуацыя кіруецца і прагназуецца, — такое меркаванне на брыфінгу выказаў журналістам Уладзімір ДЗЕРНАВЫ, начальнік галоўнага ўпраўлення прамысловасці, транспарту і сувязі Міністэрства эканомікі.**

У параўнанні з мінулым годам аб'ёмы вытворчасці знізіліся на 3,9% і склалі 96,1% па выніках са студзеня па ліпень 2009 года, аднак некаторы аптымізм у Мінэканомікі выклікае паступовае запавольванне спаду прамысловай вытворчасці: калі ў студзені гэты паказчык быў 97,1%, у лютым знізіўся да 95,5%, то ўжо ў маі ён вырас да 96,6%. А падзенне з мая па ліпень было невялікім — толькі 0,5%. Калі ж параўноўваць паказчыкі Беларусі з суседскімі, то сітуацыя, як сказаў Уладзімір Міхайлавіч, нядрэнная — у нас падзенне вытворчасці на 3,9%, у Расійскай Федэрацыі — прыкладна на 15%, ва Украіне — на 30%.

— З дзевяці галін прамысловасці за студзень—ліпень у шасці галінах, якія фарміруюць 43% прамысловай вытворчасці, назіраецца зніжэнне аб'ёмаў вытворчасці, — паведаміў Уладзімір Дзернавы. — Станоўчая ж тэндэнцыя назіраецца ў трох галінах — электраэнергетыцы, прамысловасці будматэрыялаў і лёгкай прамысловасці. Адна галіна — харчовая прамысловасць — на працягу ўсяго перыяду застаецца практычна на леташнім узроўні, а рост адбыўся па паліўнай (113,1%) і нафтахімічнай (132,4%) прамысловасцях. Як я ўжо сказаў, сярэдняя лічба — каля 96%: прыкладна ў такую велічыню мы ацэньваем вынікі і са студзеня па жнівень.

У Мінэканомікі лічаць, што станоўчыя вынікі па галінах забяспечваюць тыя прадпрыемствы, якія паспелі своечасова скарыстацца дапамогай урада — прэферэнцыямі і падатковымі паслабленнямі. Сярод тых, хто паспяхова працуе, Уладзімір Дзернавы назваў Гомельскі завод ліцця і нармаляў, Лідсельмаш, Гомсельмаш, Бярозабудматэрыялы, Магілёўскі завод «Строммашына», Баранавіцкае вытворчае баваўнянае аб'яднанне, «Марка», Магілёўхімвалакно, Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод і некаторыя іншыя.

— Найбольш сур'ёзна крызіс закрануў прадпрыемствы машынабудавання, і калі паглядзець дынаміку, то ў нас пастаяннае зніжэнне тэмпаў, якое пачалося яшчэ ў кастрычніку мінулага года і працягваецца цяпер, — кажа начальнік галоўнага ўпраўлення прамысловасці, транспарту і сувязі Мінэканомікі і прыводзіць прыклады. — Аўтамабільная прамысловасць мае тэмп росту 58%, трактарная — каля 85%, а калі браць прадпрыемствы, то ў БелАЗа — 61,5%, МАЗа — 54,6%, Амкадора — 57,1%, гэта значыць, істотныя праблемы.

Асноўнымі прычынамі такіх праблем Уладзімір Міхайлавіч лічыць звужэнне знешніх рынкаў, для машынабудавання — перш за ўсё расійскага, зніжэнне плацежаздольнасці пакупнікоў і пратэкцыянісцкая палітыка для сваёй айчыннай прадукцыі ў Расіі і ва Украіне.

Закрануў Уладзімір Дзернавы і актуальную праблему росту складскіх запасаў. Па звестках на 1 ліпеня, запасы гатовай прадукцыі склалі каля 7,3 трыльёна рублёў або 94,6% у дачыненні да сярэднемесячнага аб'ёму вытворчасці. Дарэчы, заданне, вызначанае ўрадам, нашмат меншае — 69 %:

— Заданне не выконваецца і мы адчуваем, што, хутчэй за ўсё, і па выніках года яно не будзе выканана, — сказаў Уладзімір Дзернавы. — Па валаўтваральных арганізацыях суадносіны запасаў да сярэднемесячнай вытворчасці складаюць 110,4%, найбольшыя паказчыкі па лёгкай прамысловасці (каля 219 %) і машынабудаванні (177,8 %), а найменшыя — у паліўнай прамысловасці (5,5%) і чорнай металургіі (49%).

Аднак Уладзімір Міхайлавіч бачыць і станоўчую тэндэнцыю:

— Я скажу, што за апошні час ёсць і станоўчая тэндэнцыя: калі на пачатку года негатыўная сітуацыя была на фоне зніжэння вытворчасці і росту складскіх запасаў, то з кожным перыядам велічыня прыросту запасаў зніжаецца, а з сакавіка гэта яшчэ праходзіць на фоне росту прамысловай вытворчасці.

Каб бачыць эфектыўнасць працы прадпрыемства, пастановай Саўміна № 1011 ад 1 жніўня 2009 года быў уведзены новы мэтавы паказчык — суадносіны тэмпаў росту выручкі ад рэалізацыі прадукцыі, тавараў, прац і паслуг і тэмпаў росту аб'ёмаў вытворчасці прамысловай прадукцыі. У цэлым па прамысловасці па выніках года стаіць задача выйсці на паказчык 101%, а за студзень—верасень — 96,5%.

Расказаў Уладзімір Дзернавы і пра меры, якія прымаюцца Урадам для выпраўлення негатыўных з'яў у эканоміцы. Так, ва ўсіх міністэрствах, ведамствах і канцэрнах распрацаваныя галіновыя стратэгіі па скарачэнні складскіх запасаў, якія распісаныя па месяцах да канца года і амаль штотыднёва кантралююцца на пасяджэннях у прэм'ер-міністра, а для экспартаарыентаваных прадпрыемстваў па нядаўняй пастанове Саўміна з'явілася магчымасць кампенсацыі часткі працэнтаў за карыстанне банкаўскім крэдытам за кошт рэспубліканскага бюджэту. Але адна з умоў — выкананне заданняў па зніжэнні запасаў гатовай прадукцыі.

Асобна Уладзімір Дзернавы спыніўся на ініцыятывах і прапановах малога і сярэдняга бізнэсу. Ён адзначыў, што рэгулярна праводзяцца сустрэчы з прадстаўнікамі грамадскіх арганізацый прадпрымальнікаў, і шмат якія з іх ініцыятыў альбо ўжо знайшлі адлюстраванне ў заканадаўстве, альбо прапрацоўваюцца:

— Зараз распрацаваны праект Указа Прэзідэнта аб унясенні змен і дапаўненняў ва Указ №119 «Аб спрошчанай сістэме падаткаабкладання», згодна з якім у якасці эксперыменту будзе часовае (да 2011 года) павелічэнне ў два разы аб'ёму валавай выручкі для ўжывання спрошчанай сістэмы падаткаабкладання, пры гэтым стаўкі падаткаў па гэтай спрошчанай сістэме плануецца знізіць у два разы...

Рыхтуецца комплекс дакументаў па рэалізацыі ільготнага крэдытавання Ашчадбанкам Расіі канцавых пакупнікоў менавіта беларускай прадукцыі, а таксама вядзецца праца над пашырэннем таварных пазіцый беларускай прадукцыі ў пераліку для расійскіх дзяржзакупак. Яшчэ адным важным напрамкам па прасоўванні беларускай прадукцыі ў Расію Уладзімір Міхайлавіч бачыць стварэнне сумесных зборачных прадпрыемстваў:

— Палітыка стварэння сумесных прадпрыемстваў нам цяпер выгадная, бо ў Расіі ідзе льготнае крэдытаванне перш за ўсё рэзідэнтаў Расійскай Федэрацыі.

Што датычыцца іншых замежных рынкаў, то ў 2009 годзе па лініі Мінпрама плануецца стварыць 36 сумесных зборачных прадпрыемстваў, напрыклад, зараз ідзе актыўная праца з Венесуэлай па новым напрамку — рэалізацыі там нафтатруб Беларускага металургічнага завода. Уладзімір Міхайлавіч падкрэсліў, што важна актыўна развіваць і сетку гарантыйнага і сервіснага абслугоўвання, каб можна было аператыўна дапамагаць і падтрымліваць пакупнікоў.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

### Пастанова аб кантролі над імпартам дзяржпрадпрыемстваў прынята з мэтай эканоміі валюты

Пастанова № 1000, якая абавязвае дзяржпрадпрыемствы Беларусі ажыццяўляць імпартныя закупкі толькі па ўзгадненні з кіраўнікамі органаў дзяржаўнага кіравання або іх намеснікамі, прынята з мэтай эканоміі валютных сродкаў. Аб гэтым паведаміў журналістам **начальнік галоўнага ўпраўлення прамысловасці, транспарту і сувязі Мінэканомікі Беларусі Уладзімір ДЗЕРНАВЫ,** перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Уладзімір Дзернавы адзначыў, што гэта пастанова — для службовага карыстання. Згодна з дакументам, кіраўнік павінен несці адказнасць за набыццё імпартных прамежкавых або інвестыцыйных тавараў. «Гэта значыць пытанні куплі імпартных тавараў павінны вырашацца на ўзроўні міністра або намесніка міністра, — адзначыў прадстаўнік Мінэканомікі. — Экспарт упаў, валютная выручка ўпала, таму трэба эканоміць. Акрамя эканамічных мераў (тэндар, конкурс), даводзіцца прымяняць адміністрацыйныя меры, каб эканоміць расходы валютных сродкаў».

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ЗАВОД «МАЗ-КУПАВА» ПАШЫРАЕ САЦЫЯЛЬНЫ ПАКЕТ ДЛЯ СВАІХ РАБОТНІКАЎ

**З 1 верасня работнікі завода «МАЗ-Купава», якія выхоўваюць дваіх і больш дзяцей, атрымаюць штомесячную прыбаўку да заработнай платы, паведамілі ў ТАА «АДС».**

Калі ў сям'і двое дзяцей, работнік будзе штомесяц атрымліваць дадаткова 2 базавыя велічыні (70 тысяч рублёў), калі трое — 3 базавыя велічыні (105 тысяч). Тры базавыя велічыні ў месяц будуць атрымліваць і сем'і, якія выхоўваюць непаўналетняе дзіця-інваліда.

Пры выхадзе на пенсію кожны работнік на працягу трох гадоў атрымлівае штомесяц дадаткова ад 3 да 5 базавых велічынь.

**Андрэй ПЯТРОЎ, «Мінск—Навіны».**

### АСНОЎНЫ ГАНДЛЁВЫ ПАРТНЁР — РАСІЯ

Як паведаміў намеснік старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта Віктар Міхно, шэсць з дзесяці асноўных гандлёвых партнёраў Беларусі — дзяржавы ЕС. Сёлета ў першым паўгоддзі на пастаўкі ў Нідэрланды прыпадала 18,3 працэнта агульнага аб'ёму экспарту, Латвію — 7,6, Украіну — 7,4, Польшчу — 4,4, Вялікабрытанію — 3,6, Германію — 3,3, Індыю — 2,3, Бразілію — 2,1, Літву — 1,5 %.

Але ж асноўным гандлёвым партнёрам нашай краіны па-ранейшаму застаецца Расія, на долю якой прыходзілася амаль 33 % экспарту.

### СТАЛІЦА — ЛІДАР ПА НАРАДЖАЛЬНАСЦІ

**Сёлета за сем месяцаў у Беларусі нарадзілася 63,7 тысячы дзяцей. Гэта на 2 тысячы больш, чым за такі ж час летась.**

У лідарах Мінск, дзе на працягу студзеня — ліпеня нарадзілася 12 354 дзіцяці. У Брэсцкай вобласці з'явілася на свет 10 015 немаўлят, Віцебскай — 7326, Гомельскай — 9867, Гродзенскай — 7367, Мінскай — 9631, Магілёўскай — 7172.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

### НАЗВАЛІСЯ РАБОТНІКАМІ ГАЗАВАЙ СЛУЖБЫ

**У Дубровенскім раёне затрыманы два зладзеі, якія называліся работнікамі газавай службы і энерганагляду.**

Удзень яны прыйшлі ў дом 71-гадовай жанчыны і запатрабавалі пасля агляду камунікацый заплаціць штраф у памеры 50 тысяч рублёў за няспраўнасць электраправодкі. Грошы бабуля аддала. І ўжо праз паўгадзіны звярнулася ў міліцыю. Дапамагло.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### СВІСЛАЦКІ РАЁН МАЕ НАМЕР ЭКСПАРТАВАЦЬ КАМЯНІ Ў ЕЎРОПУ

**Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў старшыня Свіслацкага райвыканкама Алег ТАРГОНСКІ.**

Разглядаецца магчымасць не проста збіраць і адгружаць камяні, але і наладзіць іх апрацоўку ў Свіслачы.

### СТВАРЫЛІ НАПРУЖАННЕ

**У дзвюх трохпакаёвых кватэрах на розных вуліцах у мікрараёне «Гомсельмаш» выгарала па пакоі. Яшчэ каля 70 мясцовых жыхароў звярнуліся ў жыллёвае рамонтна-эксплуатацыйнае ўнітарнае прадпрыемства «Сельмашаўскае» са скаргай на тое, што ў іх адначасова перагарэлі ўсе бытавыя электрапрыборы, пакінутыя ўключанымі ў разеткі.**

Прычынай здарэння стала кароткае замыканне. Робяцца захады для кампенсацыі стратаў людзям.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже здания неустановленного назначения с инв. номером 500/С-26135 общей площадью 81 кв. м, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, д. 3 (балансодержатель РУП «Кварц-авто»).**

Начальная цена – 92 877 400 белорусских рублей.

На продаваемое здание обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней и примененных экономических санкций. Продаваемое имущество обременено договором аренды.

**К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:**

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 9 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Аукцион состоится **29 сентября 2009 года** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **28 сентября 2009 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

**Телефоны для справок: (017)227 48 36, 227 40 22.**

*Па чутках і аўтарытэтна*

## «КРАМЛЁЎСКАЯ ДЫЕТА» — ШЛЯХ ДА ІНФАРКТУ?

**Здаецца, «крамлёўская» дыета прадэманстравала ўжо яе аматарам вынікі — вялікія страты для здароўя, аджыла сваё і цалкам выйшла з моды. Тым не менш, у інтэрнэце працягваюць абмяркоўваць «плюсы « і «мінусы» нізкавугляводных дыет кшталту «крамлёўскай», дзе вітаецца ўжыванне мяса і рыбы (бялковай ежы) ва ўрон крупам, макароне, садавіне і гародніне (вугляводнай ежы).**

На гэты раз падставай для размовы сталі эксперыменты даследчыкаў Гарвардскага ўніверсітэта на лабараторных мышах. Вучоным удалося вызначыць, што ў мышэй, якія ўжывалі мала вугляводаў і шмат бялку, хоць і знізілася вага, але на 15 працэнтаў павялічылася атэрасклератычнае паражэнне артэрый у параўнанні з тым, якое было б пры звычайным харчаванні. Маўляў, спачатку ўзмацняецца «наліпанне» на сасуды халестэрынавых бляшак, а там і да інфаркту з інсультам недалёка.

Што да пахудзення, то, як вядома, дыеты, як іх разумеюць у народзе, спецыялістамі па харчаванні даўно аднесены да дзейсных спосабаў хутка і якасна падарваць здароўе. Харчаванне чалавека павінна быць разнастайным і ўмераным! Прынцып просты: лепш недаесці, чым пераесці. Плюс змена становішча седзячы-лежачы на актыўную жыццёвую пазіцыю. Толькі рух нас можа ўратаваць!

Што да сасудаў, то любыя ўхілы з харчаваннем (абмежаванні той ці іншай групы прадуктаў) — не фізіялагічныя. І калі ўжо абмяжоўваць у сваім рацыёне якую-небудзь групу ежы, дык толькі не клятчатку, не садавіну з гароднінай.

— Нельга пакуль дакладна сцвярджаць, што «крамлёўская» дыета прыводзіць да інфаркту або інсульту, — тлумачыць **вядучы навуковы супрацоўнік РНПЦ «Кардыялогія» Ігар КАЗЛОЎ.** — Гэта не даказана. А вось дзеянне гароднінна-фруктовай дыеты ў дачыненні да прафілактыкі сардэчна-сасудзістых станаў несумненнае, яно даказана. Па-першае, клятчатка, кажучы простай мовай, «адцягвае ўвагу» халестэрыну на іншыя задачы ў арганізме, з-за чаго апошні адкладваецца на сценках сасудаў у меншай ступені, яго менш цыркулюе ў крыві. Па-другое, садавіна і гародніна — гэта крыніца розных антыаксідантаў, якія ў сваю чаргу абараняюць сасуды ад аксідантнага стрэсу, папярэджваюць перакіснае акісленне ліпідаў. Такім чынам, можна сцвярджаць, што дэфіцыт клятчаткі, у тым ліку гародніны і садавіны ў рацыёне — гэта фактар рызыкі развіцця сардэчна-сасудзістых захворванняў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

*Футбол*

## АДПОМСЦІЛІ ЗА ТРЭНЕРА



Верагодна, футбалісты барысаўскага БАТЭ пакрыўдзіліся за выдаленне свайго трэнера на трыбуны і вырашылі паказаць балгарскаму «Літаксу», што так з гасцямі абыходзіцца нельга. Інакш цяжка растлумачыць, чаму беларусы змаглі забіць першы гол толькі на 86 хвіліне і потым, толькі ў дадатковы час, зусім размазаць гаспадароў па полі. 4:0 — выдатны вынік! Галы забілі Сасноўскі (86 і 99 хвіліны), Радзівонаў (95-ая), Скавыш (118-я), і БАТЭ ў групавой стадыі Лігі Еўропы згуляе ў групе I разам з камандамі «Бенфіка» (Партугалія), «Эвертан» (Англія) і АЕК (Грэцыя).

Склады астатніх груп выглядаюць так: А — «Аякс» (Галандыя), «Андэрлехт» (Бельгія), «Тымішаара» (Румынія), «Дынама» (Харватыя); В — «Валенсія» (Іспанія), «Ліль» (Францыя), «Славія» (Чэхія), «Джэнаа» (Італія); С — «Гамбург» (Германія), «Селтык» (Шатландыя), «Хапаэль» (Ізраіль), «Рапід» (Аўстрыя); D — «Спортынг» (Партугалія), «Херэнвен» (Галандыя), «Вентспілс» (Латвія), «Герта» (Германія); Е — «Рома» (Італія), «Базель» (Швейцарыя), «Фулхэм» (Англія), ЦСКА (Балгарыя); F — «Панацінаікас» (Грэцыя), «Галатасарай» (Турцыя), «Дынама» (Румынія), «Штурм» (Аўстрыя); G — «Віллярэал» (Іспанія), «Лацыа» (Італія), «Леўскі» (Балгарыя), «Зальцбург» (Аўстрыя); Н — «Сцяуа» (Румынія), «Фенербахчэ» (Турцыя), «Твентэ» (Галандыя), «Шэрыф» (Малдова); J — «Шахцёр» (Украіна), «Брюге» (Бельгія), «Партызан» (Сербія), «Тулуза» (Францыя); К — ПСВ (Галандыя), «Капенгаген» (Данія), «Спарта» (Чэхія), «Клуж» (Румынія); L — «Вердэр» (Германія), «Аўстрыя» (Аўстрыя), «Атлетык» (Іспанія), «Насьянал» (Партугалія).

Матчы групавога этапу пройдуць па класічнай сістэме: каманды сустрэнуцца паміж сабой па два разы — дома і ў гасцях. Групавы турнір стартуе 17 верасня, фінішуе 17 снежня. Па дзве лепшыя каманды з кожнага квартэта выйдуць у 1/16 фіналу, дзе да іх далучацца 8 клубаў, якія зоймуць трэція месцы на групавой стадыі Лігі чэмпіёнаў.

## ЛІГА РАЗБІЛАСЯ НА ГРУПЫ

У чацвер увечары таксама сталі вядомыя ўсе 32 каманды, якія будуць удзельнічаць у групавым этапе самага прэстыжнага клубнага турніру Еўропы. У цяперашнім групавым этапе Лігі чэмпіёнаў прымуць удзел 18 пераможцаў нацыянальных першынстваў — больш, чым у любым з дзевяці апошніх сезонаў.

Група А. «Баварыя» (Германія), «Ювентус» (Італія), «Бардо» (Францыя), «Макабі» (Хайфа, Ізраіль). Група В. «Манчэстэр Юнайтэд» (Англія), ЦСКА (Расія), «Бешыкташ» (Турцыя), «Вольфсбург» (Германія). Група С. «Мілан» (Італія), «Рэал» (Іспанія), «Марсэль» (Францыя), «Цюрых» (Швейцарыя). Група D. «Чэлсі» (Англія), «Порту» (Партугалія), «Атлетыка» (Іспанія), АПОЭЛ (Кіпр). Група Е. «Ліверпуль» (Англія), «Ліён» (Францыя), «Фіарэнціна» (Італія), «Дэбрэцэн» (Венгрыя). Група F. «Барселона» (Іспанія), «Інтэр» (Італія), «Дынама» (Украіна), «Рубін» (Расія). Група G. «Севілья» (Іспанія), «Глазга Рэйнджарс» (Шатландыя), «Штутгарт (Германія), Уніра (Румынія). Група Н. «Арсенал» (Англія), АЗ (Галандыя), «Алімпіякас» (Грэцыя), «Стандард» (Бельгія).

Матчы ў групах запланаваныя на 15 і 16 верасня, 29 і 30 верасня, 20 і 21 кастрычніка, 3 і 4 лістапада, 24 і 25 лістапада, 8 і 9 снежня.

белагропромбанк
традиции будущего

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»

**СООБЩАЕТ, ЧТО 4 СЕНТЯБРЯ 2009 ГОДА ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ**

220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.

**Повестка дня**

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 26 августа 2009 года.

Акционеры банка могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк»: г. Минск, проспект Жукова, 3.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения по месту нахождения акционеров.

Бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 2 сентября 2009 года.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 11 сентября 2009 года.

**Телефоны для справок: 8(017) 250 36 53, 250 60 01.**

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136
время работы 8.00-22.00 без выходных и праздничных дней;
звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ;
звонок с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) -
по тарифам операторов мобильной связи.
www.belapb.by

*Лицензия на право осуществления банковской деятельности НБ РБ от 22.07.2009 г. № 2. УНП 100693551.*

ISSN 1990 - 763X

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.08.2009 г. (для б/н разлікаў)**

| | |
|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 2 825,00 |
| ▲ 1 еўра | 4 048,23 |
| 1 латвійскі лат | 5 765,89 |
| 1 літоўскі літ | 1 172,20 |
| 1 чэшская крона | 159,22 |
| 1 польскі злоты | 989,77 |
| ▼ 1 расійскі рубель | 89,49 |
| 1 украінская грыўня | 335,71 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў**

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 31,5687 |
| UAH | 37,5148 |
| 1000 BYR | 11,1432 |
| EUR | 45,3011 |

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАДВЁЎ ВЫНІКІ СУСТРЭЧЫ З ДЗМІТРЫЕМ МЯДЗВЕДЗЕВЫМ У СОЧЫ

**Пасля завяршэння ў Сочы сустрэчы прэзідэнтаў Беларусі і Расіі, якая прадаўжалася больш як тры гадзіны, Аляксандр Лукашэнка адказаў на пытанні журналістаў.**

«Наконт паўзы адносна нашай сустрэчы з Прэзідэнтам Расіі. Сапраўды мы не гутарылі так інтэнсіўна, як у пачатку года. Але гэта не азначае, што мы не мелі стасункаў наогул. Было шмат і пазітыўнага, і негатыўнага, але мы не перарывалі кантактаў з Дзмітрыем Анатольевічам. Напэўна, дапусцілі памылку, што не інфармавалі грамадскасць.

Мы падтрымлівалі пастаянны кантакт з Прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі, гэта было, але інфармацыі аб гэтым было мала. Што датычыцца духу гэтай сустрэчы, то такой шчырай і адкрытай размовы, як сёння, у нас не было з ім ніколі. Вельмі шкада, што час і тыя праблемы, якія ў нас сёння ёсць, — яны нас падштурхнулі да гэтага дыялога. Але сёння Прэзідэнт Расіі ініцыяваў гэту адкрытую размову, скажу, вельмі шчырую, у маім духу. Я вельмі люблю шчырасць і адкрытасць. Асабліва калі сустракаюцца сябры, таварышы, калегі, а мы вельмі сябруем з Прэзідэнтам Расіі».

Дух — гэта галоўнае, што пранізвае ўсе пытанні: фінансаў, эканомікі, дыпламатыі, знешняй палітыкі. Мы змаглі абмеркаваць усе праблемныя пытанні, якія перад намі былі.

Вынік: магу сказаць, у мяне склалася ўражанне, што ў нас з Расіяй больш такіх перыядаў, як быў, не будзе. Мы як ніколі раней адчулі сваю вялікую адказнасць, мы адчулі ўсё ж такі тое, што за намі расіяне і беларусы, практычна адзін народ, што нам дзяліць няма чаго і гісторыя даўно нас паставіла ў пэўныя рамкі. І мы вымушаны ў гэтым кантэксце дзейнічаць. Яшчэ раз падкрэсліваю, што мне нават не здаецца, я амаль упэўнены, што ў нас не будзе вось такіх нікому не выгадных, як было падкрэслена на некалькіх прыкладах, абвастрэнняў. Таму што ні расіяне, ні мы нічога не выйгралі ад гэтых абвастрэнняў.

У бліжэйшы час і ў эканоміцы, і ў палітыцы мы прымем такія прынцыповыя рашэнні, якія змогуць развязаць праблемы, якія ў нас сёння існуюць паміж дзвюма дзяржавамі. Мы прайшліся па ўсіх пытаннях парадку дня з нашага боку, і ў прынцыпе нашы пытанні, якія я вёз на разгляд, на гэту сустрэчу, былі адэкватныя тым, з якімі прыйшоў на сустрэчу Дзмітрый Анатольевіч.

Перш чым падысці да эканомікі, я пералічу ўсе пытанні і асобна скажу, якія мы прынялі.

Найперш мы абмеркавалі нашы беларуска-расійскія адносіны. Мы зыходзілі з таго, што ў нас накапіліся праблемы, якія трэба вырашаць. Праблемы непрыемныя, непатрэбныя для нашых народаў і дзяржаў, праблемы, якіх можна было пазбегнуць, але мы, на жаль, іх не пазбеглі. Мы гэта канстатавалі, шчыра адзін аднаму сказалі і прааналізавалі ўвесь спектр нашых адносінаў.

Мы дамовіліся аб тым (і з гэтага вынікае другая тэма), што Прэзідэнт Расіі прыедзе да нас у верасні — на нашы сумесныя беларуска-расійскія вучэнні, самыя маштабныя, нягледзячы на крызіс. Гэта беларуска-расійская групоўка на заходнім напрамку, аснову якой складае беларуская армія. Вучэнні будуць прысвечаны функцыянаванню гэтай групоўкі: наколькі яна эфектыўная, наколькі можа абараняць нашы заходнія рубяжы.

Другі раз ён да нас прыедзе ў канцы лістапада: у нас пройдзе пасяджэнне ЕўрАзЭС. І трэці раз мы сустрэнемся ў гэтым годзе ў пачатку снежня на пасяджэнні Вышэйшага Дзяржсавета Саюзнай дзяржавы, якое пройдзе ў Маскве.

Каб больш не пісалі, што мы рэдка сустракаемся, мы вырашылі інтэнсіфікаваць сустрэчы. У нас няма непрыняцця адзін аднаго, няма алергіі ў адносінах адзін да аднаго. Гэта абсалютна шчыра.

Таму плаўна мы ад гэтага пытання, асабліва ваеннага, перайшлі да дзейнасці АДКБ. Я яшчэ раз падкрэслю: мы прыхільнікі інтэграцыі на постсавецкай прасторы ва ўсіх сферах. Адна з тэмаў, якую мы актыўна развівалі разам з Расійскай Федэрацыяй, гэта АДКБ. Калі закранаць КСАР, пра якія цяпер так многа гавораць, што быццам бы Беларусь з Узбекістанам амаль што не супраць гэтых Калектыўных сілаў, дык я нагадаў Прэзідэнту Расіі, што мы і расіяне з'явіліся зачыншчыкамі гэтых праблем. І вельмі актыўна нашы эксперты прапрацоўвалі пытанні па Калектыўных сілах аператыўнага рэагавання. І таму не прыняць гэты дакумент у Беларусі проста не могуць. Яшчэ раз падкрэсліваю: мы шмат уклалі ў сам змест, у саму сутнасць гэтага дагавора. Па-другое, ён жа рамачны, нам баяцца тут абсалютна няма чаго.

Другая вострая тэма па АДКБ — гэта старшынства Беларусі. Чаго адмаўляцца, калі табе гэту ганаровую місію прапануюць?

Паўгода мы не працавалі ў якасці старшыні, таму вырашылі ўзяць на сябе абавязак старшынства і на наступны тэрмін. Мы будзем старшынстваваць у АДКБ, і нам трэба фармалізаваць гэты працэс юрыдычна. Напэўна, гэта будзе зроблена праз заяву беларускага боку, і мы возьмем на сябе старшынства. Тут няма праблем, гэта надуманая тэма.

І тым не менш па АДКБ мы вельмі сур'ёзна абмяркоўвалі ўвесь комплекс пытанняў, якія звязаны з ваенна-палітычным супрацоўніцтвам на постсавецкай прасторы. Вы памятаеце, прадаўжаючы ваенную тэму, што мы ў свой час заключылі пагадненне з Расійскай Федэрацыяй па стварэнні адзінай сістэмы ППА Беларусі і Расіі. Мы вельмі дакладна дамовіліся, што асноўная роля на заходнім напрамку ў сумеснай ППА належыць беларускай ППА, яе трэба мадэрнізаваць, трэба падтрымліваць. Калі наша армія на заходнім напрамку Саюзнай дзяржавы з'яўляецца асноўнай адзінкай, яе таксама трэба падтрымліваць, найперш ва ўзбраеннях. І было прапанавана і вырашана на Вышэйшым Дзяржсавеце ў лютым гэтага года, што мы падпішам пратакол да дагавора па адзінай ППА. Шчыра кажучы, усё гэта «забуксавала». І я папрасіў Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі паскорыць гэту работу. Я знайшоў поўнае разуменне і падтрымку з яго боку. Дзмітрый Мядзведзеў паабяцаў даць даручэнне міністру абароны Расіі актывізаваць гэты працэс.

Па дагаворы паміж Беларуссю і Расіяй аб будаўніцтве АЭС. Першае, што неабходна зрабіць, — інфраструктуру для гэтай атамнай электрастанцыі пад Астраўцом. Мы яе ўжо ствараем. І з 1 студзеня 2010 года пойдзе паўнацэннае будаўніцтва. Была дасягнута прынцыповая дамоўленасць, што Расійская Федэрацыя пракрэдытуе гэты праект. Цяпер узгадняецца канчатковая сума крэдыту, і мы дамовіліся, што ўжо з 2010 года Расія адкрые крэдытную лінію. Такім чынам, будаўніцтва АЭС пачалося са стварэння інфраструктуры. У 2010 годзе мы пачнём сумесную работу па будаўніцтве непасрэдна станцыі. Гэта пытанне таксама агаворана.

Далей мы абмеркавалі пытанне па мытнай пошліне на нафту, па прадастаўленні дзяржаўнага крэдыту, іншыя фінансавыя пытанні, а таксама рэалізацыю сумесных мераў па перaадоленні наступстваў фінансава-эканамічнага крызісу, пра што мы дамовіліся ў лютым на пасяджэнні Вышэйшага Дзяржсавета. Мы вызначыліся, што ў верасні нашы ўрады сядуць за стол перагавораў і развяжуць гэтыя праблемныя вузлы. Мне паабяцаў гэта Прэзідэнт Расіі. Таму даручэнні прэм'ер-міністрам будуць аддадзены сёння ж. Дзмітрый Анатольевіч сказаў, што праблемы няпростыя і ў эканоміцы Расіі іх нямала. Але, як ён адзначыў, «мы гатовы для сваёй брацкай саюзнай рэспублікі зрабіць усё для таго, каб лягчэй было і людзям, і эканоміцы». Разам мы зможам крызісныя з'явы пераадолець значна хутчэй.

Таксама мы абмеркавалі «малочныя» праблемы, якія ў нас былі. Трэба складаць балансы паставак прадукцыі. Але зноў жа, каб не было такіх канфліктаў, трэба адмаўляцца ад квот. Гэта дрэнна, што ў нашых адносінах з'яўляюцца нейкія квоты, пошліны і іншае. Мы ж Мытны саюз фарміруем. Гэтых праблем быць не павінна. Калі патрэбны будуць якія-небудзь нашы рашэнні, урады далажаць нам аб гэтым у верасні-кастрычніку.

Таксама мы ўрэгулюем пытанні па разліку за прыродны газ. Тут у нас праблем не будзе. Гэта значыць блок эканамічных пытанняў у нас прысутнічаў, але не ў ліку першачарговых тэмаў.

Далей мы абмеркавалі нашы саюзныя справы. Мы дамовіліся аб тым, што нам трэба актывізаваць узаемаадносіны ў рамках Саюза Беларусі і Расіі. Мы падышлі да абмеркавання эфектыўнасці функцыянавання Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы. Дамовіліся аб тым, што нам трэба па кадравых пытаннях разгледзець некаторыя праблемы, па змесце дзейнасці Пастаяннага камітэта пагаварыць, прыняць рашэнне па ім. Гэта штаб нашай сумеснай дзейнасці ў Саюзнай дзяржаве. Думаю, што да снежня мы выйдзем на нейкія вынікі па гэтым пытанні.

Мы таксама абмеркавалі шэраг праблем, звязаных з прысутнасцю Беларусі тут, у Сочы, у тым ліку нашага ўдзелу ў будаўніцтве аб'ектаў да Алімпіяды. Вы ведаеце, што ў Краснай Паляне мы вядзём маштабнае будаўніцтва, гэта вельмі выгадныя праекты. Нямала пабудавалі. Беларусі прадастаўляюцца зямельныя ўчасткі на ўмовах узаемнасці. Адпаведнае даручэнне даў Дзмітрый Мядзведзеў.

Шмат было і асабістага. Мне вельмі прыемна, што гэта шчырая размова завяршылася тым, што мы знайшлі поўнае ўзаемаразуменне па асноўных пытаннях нашай сумеснай дзейнасці. Мне спадабаўся падыход Прэзідэнта Расіі не толькі да абмеркавання праблем, але і да імкнення развязаць існуючыя праблемы.

Мы закранулі, абмяркоўваючы тыя ці іншыя праблемы, заходні вектар, тое, як у нас складваецца дыялог з Захадам. Але мы не абмяркоўвалі ніякай канкрэтнай тэмы нашай знешняй палітыкі, якая накіравана на Захад. Мы развівалі і будзем развіваць наша супрацоўніцтва з Еўропай, Амерыкай, таму што ў цэлым гэта той жа тавараабарот, што і з Расіяй. Дзмітрый Анатольевіч з вялікім разуменнем адрэагаваў, сказаў, што на тое і дзяржава, і кіраўніцтва гэтай дзяржавы, каб цікавасць падтрымліваць у той частцы планеты, перш за ўсё ў Еўропе, таму што Беларусь — цэнтр Еўропы. Так было сказана Прэзідэнтам Расіі».

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ВЫКАЗАЎ СПАЧУВАННІ РОДНЫМ І БЛІЗКІМ СЯРГЕЯ МІХАЛКОВА

**У сувязі са смерцю пісьменніка Героя Сацыялістычнай Працы Сяргея Міхалкова Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў глыбокія і шчырыя спачуванні яго родным і блізкім. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы.**

У спачуванні, у прыватнасці, гаворыцца:

«Усё жыццё гэтага выдатнага майстра слова было без астатку аддадзена нястомнаму служэнню Айчыне, натхнёнай творчай працы, умацаванню з дапамогай мастацкага слова ідэалаў патрыятызму, высокай маралі і гуманізму. Яго дзіўны, шматгранны талент знайшоў сваё ўвасабленне ў мностве твораў самых розных жанраў — ад тэкстаў дзяржаўных гімнаў Савецкага Саюза і Расійскай Федэрацыі да цудоўных вершаў, баек і п'ес, якія палюбіліся мільёнам юных і дарослых чытачоў.

Мы паважалі і цанілі Сяргея Уладзіміравіча як патрыярха савецкай і рускай літаратуры, аўтарытэтнага грамадскага дзеяча, даўняга і аданага сябра Беларусі, які ўнёс вялікі асабісты ўклад у захаванне і развіццё творчых сувязяў паміж пісьменнікамі братніх краін.

Светлая і ўдзячная памяць пра выдатнага пісьменніка і грамадзяніна Сяргея Уладзіміравіча Міхалкова ніколі не згасне ў нашых сэрцах».

## Бюджэт пасялковых і сельскіх Саветаў павінен быць бездатацыйны

**Такую думку выказаў карэспандэнту БЕЛТА старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Барыс Батура ў ходзе наведвання Васілішкаўскага сельскага Савета Шчучынскага раёна.**

На думку Барыса Батуры, абавязковым з'яўляецца толькі фінансаванне нешматлікага апарату пасялковых і сельскіх Саветаў. Пэўныя сродкі неабходны і для вырашэння найбольш важных сацыяльных праграм.

Прыкладам правільнага падыходу да фарміравання бюджэту, лічыць спікер верхняй палаты парламента, з'яўляецца дзейнасць Васілішкаўскага сельскага Савета. Пры планаванні бюджэту на 2010 год тут упор зроблены на зніжэнне датацыйнай нагрузкі. Плануецца, што датацыі складуць 66,9 працэнта, што ў параўнанні з 2009 годам на 16,4 працэнта менш. Гэта плануецца кампенсаваць за кошт даходаў ад рэалізацыі дзяржмаёмасці і продажу зямельных участкаў грамадзянам, а таксама развіцця экатурызму і спонсарскай дапамогі.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

По поручению ОАО «Оргпищепром», КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит повторный открытый аукцион по продаже следующего оборудования (цена снижена на 45 %):

| № ЛОТА | Наименование оборудования | Местонахождение | Начальная цена, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | гильотинные ножницы (1967 г.в.), пресс ножницы (1972 г.в.), кран-балка (2 ед.: 1960, 1984 г.в.), тельфер (2 ед.: 1980, 1983 г.в.), станок токарно-шлифовальный (1970 г.в.), станок зубофрезерный (1956 г.в.), вальцы механические (1968 г.в.), станок наждачно-заточный (1968 г.в.), станок вертикально-сверлильный (1977 г.в.) | Могилевская обл., г. Климовичи, ул. Железнодорожная, 32 | 44 769 213 |
| 2 | термопласт автомат «КУАСИ» (1986 г.в.) | г. Минск, пер. С. Ковалевской, 44 | 45 653 572 |
| 3 | вертикально-сверлильный станок (1980 г.в.) | | 2 910 116 |
| 4 | фрезерный станок (1976 г.в.) | | 4 911 632 |
| 5 | токарно-винтовой станок (1983 г.в.) | | 2 860 143 |
| 6 | пресс КВ-235 (1969 г.в.) | | 3 543 540 |
| 7 | пресс КД-2328 (1979 г.в.) | | 4 779 236 |

Задаток 10 % от начальной цены. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 20.06.2009 г. Аукцион состоится **08.09.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.09.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

**Контактный телефон (8017) 2246134.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by**

## ФОНД «МИНСКГОРИМУЩЕСТВО»
### СООБЩАЕТ,

что в соответствии с решением Минского исполнительного комитета от 20.08.2009 № 1985 с 01.09.2009 начинается обмен находящихся в коммунальной собственности г. Минска **акций ОАО «МАПИД»** на **ИПЧ «Имущество»** граждан Республики Беларусь через обособленные подразделения ОАО «АСБ Беларусбанк» по г. Минску и Любанскому району Минской области.

УНП 100008115.

**Считать недействительными квитанции о приеме наличных денежных средств формы 1-СУ серии КВ № 0021557, 0010020, ГС 5584530, страховые свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии АЖ № 2554266, 2554267, 3522375 СООО «Белкоопстрах».**

# ПРАБЛЕМА №1 — ЯКАСЦЬ АДУКАЦЫІ

*(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 28 жніўня.)*

Асобна Тацццяна Кавалёва спынілася на матэрыяльна-тэхнічным стане ўстаноў адукацыі і бяспецы навучэнцаў. Як сведчыць статыстыка, большая палова няшчасных выпадкаў ва ўстановах адукацыі адбываецца падчас заняткаў фізкультурай (161 выпадак за апошні навучальны год). «Колькі смяротных зыходаў пацягнула за сабой падзенне незамацаваных футбольных варотаў? Толькі ў мінулым навучальным годзе — два! Але навучальныя ўстановы, дзе футбольныя вароты застаюцца не замацаванымі, усё яшчэ выяўляюцца, — падкрэсліла намеснік міністра. — Да таго ж ва ўмовах недахопу фабрычнага абсталявання для заняткаў фізічнай культурай і спортам у навучальных установах шырока выкарыстоўваецца нестандартнае абсталяванне, не заўсёды добра замацаванае, якое не мае тэхнічных умоў». За апошнія гады забяспечанасць устаноў адукацыі спартыўным рыштункам і абсталяваннем хоць і палепшылася, але ўсё адно складае толькі 58 працэнтаў ад патрэбы. Найлепшыя паказчыкі — у Мінску, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях.

Сацыяльны стандарт па аснашчанасці камп'ютарнай тэхнікай з разліку 1 працоўнае месца на 30 школьнікаў выконваецца паўсюдна. Аднак у шэрагу раёнаў у працэсе навучання выкарыстоўваецца маральна састарэлая камп'ютарная тэхніка, выпушчаная да 1997 года (у Баранавічах, Маларыцкім раёне і іншых). Гэта вымагае дадатковых мераў для бяспекі працы на гэтых камп'ютарах. Развіццёвае прадметнае асяроддзе большасці дашкольных устаноў адпавядае сучасным патрабаванням таксама толькі на 50 працэнтаў.

На думку міністра адукацыі Аляксандра Радзькова, беларускай школе востра патрэбны айчынны вытворца навучальнага абсталявання. «Зразумела, што ёсць абсталяванне, якое нявыгадна вырабляць у нашай краіне, паколькі заказ на яго будзе невялікі і не штогадовы. Аднак спартыўны рыштунак, фізічныя і хімічныя прыборы, колбы, прабіркі — усе гэта можна вырабляць і самім. І нават інтэрактыўныя дошкі маглі б выпускацца на беларускіх прадпрыемствах «Віцязь» і «Гарызонт», — упэўнены кіраўнік галоўнага адукацыйнага ведамства. Беларускія педагогі пакуль не могуць даць адказу на пытанне, якая роля ў выхаванні маладога пакалення павінна быць адведзена камп'ютару і камп'ютарным тэхналогіям. «Сумняваюся, што віртуальная фізічная або хімічная лабараторыя змогуць калі-небудзь цалкам замяніць жывую практыку, бо дзецям усё трэба памацаць сваімі рукамі. Работа з камп'ютарам, зразумела, таксама важная. Але і іншыя формы навучання не павінны адыходзіць на задні план, — падкрэсліў Аляксандр Радзькоў. — А ці не выціснуў кам'ютар з жыцця нашых школьнікаў кнігу, якая развівае дзіця і стымулюе яго фантазію? На жаль, з-за захаплення камп'ютарам дзеці ўсё часцей адмаўляюцца ад чытання і мастацкай, і навукова-папулярнай літаратуры».

Звярнуў увагу Аляксандр Радзькоў і на неабходнасць абавязкова прыцягваць да вучэбна-выхаваўчага працэсу сям'ю: «Трэба тэрмінова нешта рабіць з утрыманскімі настроямі бацькоў, у якіх галоўная задача — куды-небудзь сваё дзіця ўладкаваць, прычым яны гатовы гэта рабіць ужо ў паўтарагадовым узросце: няхай іх дзіця хтосьці развівае... Але самі яны пры гэтым застаюцца ўбаку, не разумеючы, што ў гэтым узросце ніхто не дасць іх дзіцяці больш, чым яны самі...»

Рэктар Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта Дзмітрый Лазоўскі закрануў праблему экспарту адукацыйных паслуг вышэйшай школы. «Адукацыя — гэта бізнэс, а любы бізнэс абавязкова павінен быць рэнтабельным. Мы сябе пастаянна ўхваляем, аднак у Беларусь едуць атрымліваць адукацыю пераважна грамадзяне з краін так званага трэцяга свету або з рэспублік былога Савецкага Саюза. Хто-небудзь цікавіўся, чаму грамадзяне краін Паўднёва-Усходняй Азіі едуць навучацца ў Канаду, Аўстралію, ЗША, а не ў еўрапейскія краіны? Адна з прычын — для студэнтаў там больш таннае жыццё, чым у Еўропе. Другая прычына — усе імкнуцца атрымліваць адукацыю на англійскай мове, а ў краінах Еўропы навучанне на першай ступені вышэйшай адукацыі, як правіла, ажыццяўляецца на нацыянальнай мове».

На думку Дзмітрыя Лазоўскага, беларускай вышэйшай школе трэба інтэнсіфікаваць навучальны працэс і скарачаць тэрміны падрыхтоўкі спецыялістаў. «Няўжо ў Італіі рыхтуюць горшых архітэктараў, чым у Беларусі? Аднак у Італіі на падрыхтоўку архітэктара адводзяцца чатыры гады. Трэба мець на ўвазе, што маладыя людзі імкнуцца як мага хутчэй сябе рэалізаваць і знайсці сваё месца ў жыцці. Таму ў гэтым пытанні мы адназначна прайграём Еўропе», — рэзюмаваў рэктар Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Ёсць яшчэ адна праблема, якая стрымлівае рост экспарту адукацыйных паслуг, — гэта адсутнасць дастатковай колькасці камфартабельных месцаў у студэнцкіх інтэрнатах. У сувязі з гэтым зараз разглядаецца магчымасць задзейнічаць інтэрнаты сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў — каб тыя падзяліліся сваімі месцамі з ВНУ, якія развіваюць экспартную палітыку. Да таго ж Міністэрства адукацыі сумесна з Міністэрствам па падатках і зборах вывучае пытанне аб увядзенні падатковых ільгот для грамадзян, якія прапануюць сваё жыллё студэнтам.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЦЯГНІК АНКАРА—СТАМБУЛ УРЭЗАЎСЯ Ў ЭКСКАВАТАР



**У выніку аварыі на чыгунцы ў Турцыі загінулі пяць чалавек. Экспрэс, які ішоў з Анкары ў Стамбул, урэзаўся ў экскаватар, які знаходзіўся на пуцях.**

У выніку здарэння некалькі вагонаў цягніка сышлі з рэек, адзін з іх перавярнуўся. Чаму на чыгуначных пуцях апынуўся староні транспартны сродак, не паведамляецца. Па апошніх звестках, параненыя 16 чалавек.

### КОЛЬКАСЦЬ БЕДНЯКОЎ У РАСІІ ПЕРАВЫСІЛА 24 МІЛЬЁНЫ ЧАЛАВЕК

**Колькасць жыхароў Расіі з даходам, ніжэйшым за пражытковы мінімум, склала ў першым квартале гэтага года 24,5 мільёна чалавек, або 17,4 працэнта ад агульнай колькасці насельніцтва. Аб гэтым гаворыцца ў афіцыйным прэс-рэлізе, апублікаваным на сайце Расстата.**

Для параўнання, па выніках 2008 года колькасць бедных расіян склала 18,5 мільёна чалавек, або 13,1 працэнта агульнай колькасці насельніцтва. Пражытачны мінімум у Расіі ў студзені—сакавіку 2009 года ў сярэднім склаў 5083 рублі, для пенсіянераў — 4044 рублі, а для працаздольнага насельніцтва — 5497 рублёў. У параўнанні з чацвёртым кварталам мінулага года велічыня пражытковага мінімуму павялічылася на 8,3 працэнта. У канцы мая старшыня Федэрацыі незалежных прафсаюзаў Расіі Міхаіл Шмакаў паведаміў, што пятая частка вакансій, размешчаных працадаўцамі, прапаноўвае сушукальнікам зарплату, ніжэйшую за пражытковы мінімум. Па звестках на канец ліпеня, у Расіі зарэгістравана 2,47 мільёна беспрацоўных. З 1 студзеня 2009 года максімальны памер дапамогі па беспрацоўі быў падвышаны з 3124 да 4900 рублёў.

### БЕРЛУСКОНІ ЗАПАТРАБАВАЎ КАМПЕНСАЦЫЮ ЗА ЗВЕРНУТЫЯ ДА ЯГО ПЫТАННІ

**Італьянскі прэм'ер-міністр Сільвіа Берлусконі падаў іск супраць газеты La Repubblica з патрабаваннем выплаціць яму адзін мільён еўра за публікацыю пытанняў аб яго асабістым жыцці, на якія прэм'ер адмовіўся адказваць.**

Берлусконі растлумачыў, чаму ён адмовіўся адказваць на зададзеныя яму журналістамі 10 пытанняў. Па яго меркаванні, пытанні з'яўляюцца «рытарычнымі і паклёпніцкімі». У іх надуманыя, на думку прэм'ера, факты пададзеныя як няўхільная ісціна, што фарміруе ў чытача памылковае ўражанне. Акрамя пытанняў аб асабістым жыцці, прэм'ера таксама абурыў апублікаваны ў газеце артыкул аб сувязях італьянскіх уладных структур з «рускай мафіяй».

### РАСІЯНЕ НАЗВАЛІ САМЫЯ ПРЫБЫТКОВЫЯ ПРАФЕСІІ

**Расіяне лічаць прафесію банкіра самой прыбытковай. Так думаюць 43 працэнты ўдзельнікаў апытання, праведзенага «Левада-цэнтрам» у сярэдзіне жніўня 2009 года.**

На другім месцы па папулярнасці ў расіян апынуліся «зоркі» эстрады. Самай прыбытковай прафесіяй шоу-бізнэсмена лічаць 24 працэнты апытаных. Трэці радок занялі суддзі, пракуроры і адвакаты — самымі прыбытковымі іх прафесіі назвалі 23 працэнты рэспандэнтаў. 10 працэнтаў апытаных назвалі прыбытковай прафесію ўрача. Удвая больш рэспандэнтаў (каля 20 працэнтаў) лічаць, што самай выгаднай з'яўляецца прафесія міністра, дэпутата і ўрадавага чыноўніка. Замыкаюць спіс пісьменнікі, мастакі, навукоўцы, афіцэры арміі і прафесійныя жабракі. За прыбытковасць гэтых прафесій выказалася па адным працэнце ўдзельнікаў апытання.

## Абзац

◢ Рознічныя цэны на гарэлку ў Беларусі з сённяшняга дня павысіліся ў сярэднім на 2,5 працэнта. Гэта прадугледжана пастановай Мінэканомікі краіны нумар 145.

◢ **У выніку парываў моцнага ветру ў вёсцы Каплічы Калінкавіцкага раёна пашкоджаныя дахі на 30 жылых дамах, на 4-х разбураныя цалкам. Пачатыя ўзнаўленчыя працы.**

◢ Сардэчны прыступ стаў прычынай ДТЗ у Мінску. Грузавік, што перавозіў салёную рыбу, трапіў у аварыю на праспекце Пушкіна. Згодна з папярэднімі звесткамі, вадзіцель грузавіка «Івека» спачатку зачапіў адзін МАЗ, а пасля на святлафоры ўрэзаўся яшчэ ў адзін. Як мяркуецца, вадзіцелю стала дрэнна за рулём. Яшчэ адно НЗ з удзелам фуры адбылося непадалёк ад аўтарынка. Машына, нагружаная бананамі, перакулілася на перакрыжаванні з МКАД. Па словах вадзіцеля, прычынай стала заклініванне руля.

## Поўны абзац

◢ **Італьянскі рэстаратар хацеў зрабіць зніжку гасцям з Расіі, якія павячэралі ў яго на істотную суму, аднак замест гэтага атрымаў некалькі тысяч на чай. Рускія — дамы ў вячэрніх строях, мужчыны ў чорных гарнітурах і белых кашулях без гальштукаў — прыехалі ў рэстаран і замовілі дарагія стравы і напоі. Як расказаў уладальнік рэстарацыі, ім прыгатавалі крабаў, якіх вылавілі асаблівым метадам у Аўстраліі і прывезлі ў рэстаран жывымі. Толькі дзве бутэлькі віна каштавалі каля 10 тыс. еўра. Падрыхтаваўшы рахунак, гаспадар вырашыў зрабіць гасцям зніжку ў 500 еўра. Дзве крэдытныя карткі, якімі хацелі расплаціцца мужчыны, не спрацавалі. Тады адна з жанчын дастала 15 тыс. еўра наяўнымі. Рэстаратар паспрабаваў даць рэшту ў 4 тыс. еўра, аднак яму было заяўлена, што гэта чаявыя. Госці селі ў чорны Bentley і паехалі на Першы фестываль рускай культуры, што праводзіцца па ініцыятыве мясцовага мэра.**

◢ Па кошце прэстыжнага аўтамабіля «Ферары» пайшоў учора «з малатка» на аўкцыёне ў Шатландыі баран-вытворнік. Фермер, што пражывае непадалёк, выклаў за яго 231 тыс. фунтаў стэрлінгаў (прыкладна 263 тыс. еўра). Баран будзе выкарыстоўвацца выключна для ўзнаўлення статку і ў найбліжэйшы час можа акупіць выдаткі на яго набыццё. Папярэдні рэкардсмен кошту на аўкцыёне быў прададзены за 130 тыс. фунтаў. Ён пакрыў больш за 1000 авечак, што прынесла яго ўладальніку даход у 1 млн еўра.

◢ **У Латвіі з пітомніка ў лес збеглі 153 алені. Як высветлілася, умовы для ўцёкаў ім забяспечылі мясцовыя бабры, якія падгрызлі дрэвы каля плота. Дрэвы ўпалі і пашкодзілі агароджу, і алені змаглі збегчы. Вярнуць удалося толькі палову статку. Між тым самка аленя каштуе каля 700 еўра, а самец — да 2000 еўра.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО» (организатор аукциона) 1 октября 2009 года по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит аукционы по продаже объектов, находящихся в республиканской собственности, и права заключения договоров аренды земельных участков для их обслуживания, которые составляют единые предметы аукциона

**На аукционные торги выставляются:**

| Время проведения аукционов | Сведения о предмете аукциона, начальная цена предмета аукциона, размер задатка, белорусских рублей |
|---|---|
| 11.00 | **ЛОТ № 1: Капитальное строение (инв. № 631/С-11988)** и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания. Общая площадь – 291,9 кв.м. Год постройки – 1957. Одноэтажное здание конторы и склада с двумя пристройками, сараями и уборной, фундамент бутобетонный, стены бревенчатые, перегородки деревянные, перекрытие деревянное, крыша шиферная, отопление печное. Объект расположен по адресу: Минская область, г. Вилейка, ул. Красноармейская, д. 19 на земельном участке площадью 0,0974 га, отведенном для размещения объектов административного назначения. Срок аренды земельного участка 50 лет. |
| | **Начальная цена предмета аукциона:** 32 338 838 белорусских рублей (в т.ч. недвижимое имущество: 31 179 064, право заключения договора аренды земельного участка 1 159 774). **Размер задатка** – 3 000 000 белорусских рублей. |
| | **ЛОТ № 2: Капитальное строение (инв. № 631/С-11983)** общей площадью 479,5 кв.м, 1971 года постройки. Здание гаража одноэтажное, фундамент бутобетонный, стены – блок, кирпич, перегородки блок, крыша шиферная. **Капитальное строение (инв. № 631/С-11985)** общей площадью 674,5 кв.м, 1982 года постройки. Здание гаражей одноэтажное, фундамент – фундаментный блок, стены и перегородки кирпичные, блочные, перекрытия ж/б плиты, дощатые, крыша рулонная шиферная. Двор мощеный (асфальтобетонный) площадью 846 кв.м. **Капитальное строение (инв. № 631/С-11986)** общей площадью 201,6 кв.м, 1973 года постройки. Здание пожарно-химической станции, одноэтажное, фундамент бутобетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытие деревянное, крыша шиферная, отопление печное. Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Вилейка, ул. Чайковского, д. 62 на земельном участке площадью 0,8027 га, отведенном для размещения объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей. Срок аренды земельного участка 50 лет. |
| | **Начальная цена предмета аукциона:** 270 071 610 белорусских рублей (в т.ч. недвижимое имущество: 256 162 556, право заключения договора аренды земельного участка 13 909 054). Размер задатка – 27 000 000 белорусских рублей. |
| **Продавец имущества:** Государственное опытное лесохозяйственное учреждение «Вилейский опытный лесхоз» (Минская область, г. Вилейка, ул. Стахановская, 221, тел. (801771) 55 388). **Арендодатель земельного участка:** Вилейский районный исполнительный комитет (Минская область, г. Вилейка, ул. Партизанская, 40). | |
| 12.00 | **Капитальное строение (инв. № 600/С-60154)** общей площадью 324,4 кв.м. 1960 года постройки. Одноэтажное здание столовой с подвалом, фундамент блочный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия деревянные, крыша – кровельная сталь. **Капитальное строение (инв. № 600/С-60158)** общей площадью 477,4 кв.м, 1960 года постройки. Одноэтажное здание спального корпуса № 2 с 3-мя пристройками и навесом, фундамент блочный, стены бревенчатые, перегородки дощатые, крыша – кровельная сталь. **Капитальное строение (инв. № 600/С-60160)** общей площадью 309,5 кв.м, 1960 года постройки. Одноэтажное здание спального корпуса № 3 с навесом, фундамент блочный, стены кирпичные, перегородки дощатые, перекрытия деревянные, крыша шиферная. **Капитальное строение (инв. № 600/С-60162)** общей площадью 136,3 кв.м, 1960 года постройки. Одноэтажное административное здание № 4 с 2-мя пристройками, фундамент кирпичный, стены бревенчатые, перегородки дощатые, крыша шиферная. **Капитальное строение (инв. № 600/С-60164)** общей площадью 56,3 кв.м, 1960 года постройки. Одноэтажное здание – хозпостройки, фундамент – деревянные столбы, стены и перегородки дощатые, крыша шиферная. **Капитальное строение (инв. № 600/С-60157)** общей площадью 14,7 кв.м, 1955 года постройки. Одноэтажное здание туалетов, фундамент, стены и перегородки кирпичные, крыша шиферная. **Капитальное строение (инв. № 600/С-60155)** общей площадью 115,0 кв.м, 1952 года постройки. Одноэтажное здание котельной (склад), фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытие – железобетонные плиты, крыша шиферная. **Капитальное строение (инв. № 600/С-93135)** общей площадью 10,8 кв.м, 1952 года постройки. Одноэтажное сооружение водокачки (водонапорная башня), фундамент, стены кирпичные, крыша шиферная, перекрытия деревянные. **Капитальное строение (инв. № 600/С-60163)** общей площадью 77,2 кв.м, 1985 года постройки. Одноэтажный домик сборно-разборный с навесом, фундамент блочный, стены щитовые, перегородки дощатые, крыша шиферная. Также имеются: арка деревянная, забор с металлической сеткой, забор деревянный, две беседки, трансформаторная подстанция, сад фруктовый. Подведены инженерные коммуникации: электроснабжение, водопровод, канализация. Капитальные строения расположены по адресу: Минская область, Минский район, Крупицкий с/с, дер. Аннополь на земельном участке площадью 2,7491 га. **Условия использования земельного участка:** для размещения объекта оздоровительного назначения. Срок аренды земельного участка – 50 лет. |
| | **Начальная цена предмета аукциона:** 356 522 970 белорусских рублей (в т.ч. недвижимое имущество: 245 520 510, право заключения договора аренды земельного участка 111 002 460). Размер задатка – 35 000 000 белорусских рублей. |
| **Продавец имущества:** Учреждение образования «Международный государственный экологический университет имени А.Д. Сахарова» (г. Минск, ул. Долгобродская, 23, тел.: 299 51 37, 230 69 98, 230 68 97). Арендодатель земельного участка: Минский районный исполнительный комитет (г. Минск, ул. Ольшевского, 8). | |
| **Задаток перечисляется в срок по 29 сентября 2009 года включительно** на расчетный счет **№ 3642900000841** в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНП 100128686, получатель платежа – фонд «Минскоблгосимущество». | |

Фотографии продаваемых объектов, а также информация об объявленном аукционе и предметах аукциона дополнительно размещается на сайте Минского облисполкома: **www.minsk-region.gov.by** на странице фонда «Минскоблгосимущество» в разделах «Власть», «Управления и комитеты облисполкома».

**К участию в аукционных торгах допускаются:** граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительство за границей, и лица без гражданства), представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, заявление на участие в аукционе, заключившие соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, по формам, утвержденным постановлением Государственного комитета по имуществу от 23 апреля 2008 г. № 29 «Об утверждении форм документов». К заявлению на участие в аукционе прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

**ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:** 1. Подписать протокол о результатах аукциона;

2. В течение 10 рабочих дней со дня принятия местным районным исполнительным комитетом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка; внести плату, взимаемую за право заключения договора аренды земельного участка (рассрочка не предоставляется).

3. После совершения победителем аукциона действий, названных в пункте 2, но не позднее 2 рабочих дней, заключить в установленном порядке с Продавцом имущества договор купли-продажи недвижимого имущества, а с Арендодателем земельного участка – договор аренды земельного участка.

4. После заключения с райисполкомом договора аренды земельного участка в 2-месячный срок со дня даты принятия решения о передаче победителю земельного участка осуществить государственную регистрацию права на земельный участок.

5. Получить в установленном порядке разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в сроки, установленные решениями местных райисполкомов, и осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462. Фонд «Минскоблгосимущество» вправе отказаться от проведения аукциона (продажи конкретного предмета аукциона) в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала проведения аукциона по каждому объекту, выставляемому на аукцион.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 320, тел.: 224 39 76, 500 47 10.** Последний день подачи заявок **29 сентября 2009 г. до 17.00.** Участникам аукциона необходимо пройти заключительную регистрацию перед началом аукциона. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

Ведай сваё!

# «Бусел, сімвал Беларусі, з'явіўся ў нас параўнальна нядаўна...»

**Арнітолаг Аляксандр ВІНЧЭЎСКІ расказвае, якіх птушак трымалі Радзівілы, хто быў першым беларускім арнітолагам, і колькі відаў птушак можа пабачыць беларус на свае вочы**

Колькі вы бачылі на свае вочы розных птушак — 10, 15?.. А колькі можаце назваць — 20, 25?.. Чалавек, з якім мы сядзім і п'ём зялёную гарбату, бачыў на свае вочы 243 розныя птушкі ў Беларусі і 800 відаў — у свеце. Дзеля гэтага знаны беларускі арнітолаг Аляксандр Вінчэўскі за 20 гадоў аб'ехаў 31 краіну свету, а штогод здзяйсняе па Беларусі дзясяткі вандровак. Арнітолагі — гэта захопленыя людзі, якія гатовыя сарвацца і паляцець у іншую краіну, каб пабачыць нейкую новую птушку. У Беларусі пры грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» нават існуе «Клуб 200», які аб'ядноўвае людзей, што бачылі на свае вочы ў Беларусі 200 і болей відаў птушак. Дарэчы, усяго ў нас вядома 317 відаў птушак...

Мы размаўляем, як раптам у Вінчэўскага звоніць тэлефон.

***— ...У вас нават тэлефон звоніць птушыным спевам!..***

— Паўднёвы салавей, — удакладняе Вінчэўскі. — У нас ён не жыве, толькі ў Заходняй Еўропе, паўднёвай Украіне... Я запісаў ягоны спеў у гарах у Азербайджане...

***— Спадар Аляксандр, за стагоддзі гісторыі Беларусі наколькі змяніўся наш птушыны свет?***

— Змяніўся даволі істотна. Бадай, галоўная прычына — глабальнае пацяпленне, якое падступае да нас павольна, але цягам стагоддзяў істотна паўплывала на «птушыны» склад Беларусі. Другі істотны фактар — дзейнасць чалавека, праз якую ў нас знікла каля 10 відаў птушак — толькі за XX стагоддзе! Гэта, напрыклад, сокал-падарожнік, які гнездаваўся ў нас да 70-х гадоў, пасля гэтага ніводнага ягонага гнязда не знойдзена. Хоць, напрыклад, у сярэдзіне XX стагоддзя гэтых птушак было каля 100 пар. Знікненне гэтага віду звязана з ужываннем пестыцыдаў у сельскай гаспадарцы. Бо пестыцыды праз расліны траплялі да малых птушак, якіх ядуць драпежныя птушкі. Пестыцыды назапашваліся — і ўплывалі такім чынам, што шкарлупінне яек рабілася вельмі-вельмі тонкім. Птушкі, калі нават наседжвалі гэтыя яйкі, то яны біліся пасля, трэскаліся... Цяпер мы маем надзею, што гэты сокал вернецца, бо ён сустракаецца ўзімку, на міграцыях... Дарэчы, гэта самая хуткая птушка ў свеце — калі яна ловіць сваю здабычу, дык развівае хуткасць да 300 кіламетраў за гадзіну!

***— Гэта значыць, што колькі стагоддзяў таму наш птушыны свет быў іншым?..***

— Калі глядзець у Сярэднявечча, дык мы не маем нейкіх асаблівых запісаў... Хіба што Жылібер (каралеўскі батанік у Гародні. — **Аўт.**) штосьці пісаў пра птушак Беларусі. Але мы ведаем, які быў ландшафт Беларусі ў той час — тады практычна не было штучных паплаваў і палёў, і Беларусь на 90 працэнтаў была лясная краіна. Вядома, тут было больш лясных птушак. А ўсе стэпавыя птушкі з'явіліся пазней, калі нашы продкі пакрысе сталі высякаць гэтыя лясы. Тыя ж жаўрукі, белыя буслы (якія цяпер лічацца сімвалам Беларусі) з'явіліся пазней, пасля Сярэднявечча. І ластаўкі — вясковыя, гарадскія, галубы — гэта больш горныя птушкі. Яны і зараз жывуць на скалах у Міжземнамор'і. А ў Беларусі скалаў няма — як яны тут апынуліся? Калі чалавек пачаў будаваць тут замкі, мураваныя будынкі — яны і сталі гэткімі «скаламі» для птушак. Дарэчы, і вераб'і прыйшлі да нас з Афрыкі — бо гэта амаль выключна гарадская птушка, асабліва дамовы верабей.

***— Спадар Аляксандр, вядома, якіх птушак беларусы ядуць: курэй, гусей, індыкоў... А ці былі птушкі, да якіх беларусы ставіліся б з пашанай?***

— Беларусы, гэтак, як і ўсе астатнія плямёны і народы Еўропы, былі паганцы. І найлепшыя якасці Багоў, у якіх яны верылі, яны прысвойвалі птушкам ды жывёлам, якіх яны бачылі ў лясах. Беларусы тысячу гадоў таму былі больш звязаныя з прыродай, чым цяпер. Нават вясковыя жыхары калі і ходзяць на балота ці ў лес, дык у грыбы ці ў ягады. Таму і ведаюць менш. А нашы продкі ведалі больш пра птушак. Зразумела, што і паляўнічыя ў той час былі іншыя, следапыты, цяпер такіх засталося мала. У народзе захавалася многа своеасаблівых назваў птушак. Напрыклад, у нас усіх драпежных птушак называюць каршунамі ці шулякамі. Ястрабаў завуць каршуны, сокалаў завуць каршуны, каршуноў завуць каршуны, канюхоў завуць каршуны... Хоць каршун, насамрэч, настолькі цяпер рэдкая птушка ў Беларусі,



З сынам Мікалаем на Волме.

што ў 99 % выпадкаў, калі чалавек лічыць, што бачыў каршуна, гэта не каршун... У нас цяпер існуе два віды каршуноў — Чорны каршун, які жыве ўздоўж рэкаў, і Чырвоны каршун, якога вядома толькі адна (!) пара, якая гняздзіцца каля Сапоцкіна... Адкуль у людзей было нейкае адмысловае стаўленне да птушак? Не адтуль жа, што бачылі пудзілы птушак... А таму, што бачылі ў лесе, як арол змагаецца з большай па памерах птушкай ці жывёлінай, як ён выжывае ўзімку, як гадуе птушанятаў... Вось і мелі павагу да арлоў-маркутоў, арланаў-белахвостаў (гэта самая вялікая драпежная птушка ў Беларусі), пугачоў... Вельмі шанавалі ластавак, бо яны ядуць жамяру, якая дапякае людзей і быдла. Увогуле, усе птушкі шанаваліся ўвесну, калі пасля зімы прырода ажывала, калі птушкі спявалі. Сінічка заспявала — значыцца, ідзе вясна, лягчэй яе чакаць. Нават калі гэта было ў лютым... Таму многія нашы абрады, прымаўкі, звычаі, звязаныя з птушкамі, у палове нашых песень згадваюцца птушкі...

***— Сёння беларусы трымаюць у хаце папугайчыкаў, канарэек... А якіх птушак трымалі беларусы раней?***

— Калі казаць пра шляхту, дык Радзівілы ў Нясвіжы трымалі індыйскіх паўлінаў — гэта дакладна вядома, там быў нават своеасаблівы заапарк. Але ж экзатычных птушак маглі дазволіць сабе толькі заможныя людзі. Простыя людзі трымалі птушак, якія ядуць насенне, — тое, што можна лёгка здабыць, каб карміць яе. Гэта зяблікі, стрынаткі, жаўрукі... Больш, зразумела, трымалі тых, якія добра спяваюць: салаўі, чыжы, гілі... Я сам птушак ніколі не трымаў, таму мне і цяжка сказаць, каго трымалі...

***— Скажыце, а калі з'явіліся арнітолагі ў Беларусі?***

— Заснавальнікам беларускай арніталогіі лічыцца граф Канстанцін Тызенгаўз. Гэта вядомы беларускі род, які меў некалькі маёнткаў — у Жалудку, Паставах. У Паставах і сёння існуе палац Тызенгаўзаў. З дапамогай грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» і ахвяраванняў беларускіх аматараў птушак была выраблена адмысловая шыльда ў гонар Канстанціна Тызенгаўза, ды ўсталяваная з дазволу дыяцэзіі на касцёле ў Жалудку... Канстанцін Тызенгаўз назіраў за птушкамі ў 1860-х гадах. З ім здарыўся цікавы выпадак — ён апісаў новы для навукі від соваў, і назваў яго Сава драбнавокая. А пасля высветлілася, што гэта не новы від соваў, а барадатая кугакаўка, у якой у Беларусі ёсць вельмі ўнікальная ды цікавая папуляцыя. Гэта ўвогуле паўночная сава, у нас яны жыве літаральна такой «выспачкай». І сучасныя арнітолагі, пасля Тызенгаўза, адкрылі яе для сябе толькі ў 1970-х гадах, 30 гадоў таму — калі знайшлі яе папуляцыю вакол Целяханаў, на Выганашчанскіх балотах, там гняздуецца каля 20-30 пар гэтых соваў. Многія арнітолагі з замежжа, з Заходняй Еўропы, едуць да нас, каб паглядзець гэтую саву. Дарэчы, згаданы мной Тызенгаўз напісаў шмат кніг па арніталогіі, навуковыя артыкулы... Калі ён ужо быў хворы і паміраў, была зіма. І ён сказаў: «Вось бы пачуць, як спявае жаўрук». Прыйшла вясна, адчынілі акно — і Тызенгаўз пачуў, як заспяваў першы жаўрук. І памёр...

***— Ці часта ў Беларусі з'яўляюцца новыя віды птушак?***

— У сярэднім раз на год. Літаральна днямі зафіксавалі новы від — малога баклана, да гэтага ў студзені — горную пліску... Быў такі цікавы выпадак у мінулым годзе, калі ў нас адзначылі новы від сокалаў — сокал-балобан. Гэта другі па памеры, пасля белазора, сокал у Еўропе. Але балобана ніхто не здолеў пабачыць! Прычына ў тым, што нашы вугорскія калегі павесілі на некалькіх сокалаў спадарожнікавыя перадатчыкі. І праз спадарожнік яны бачылі, што гэтыя сокалы заляцелі ў Беларусь і вылецелі з яе! Сябры «Клуба 200» ездзілі на адно такое месца ў Палессі, дзе сокал праз дажджы сядзеў тыдзень. Мы кожны дзень звязваліся з вугорцамі, яны казалі: ён там сядзіць на полі, едзьце глядзіце! Але пакуль нашы арнітолагі даехалі, дажджы скончыліся, і балобан зляцеў — яны яго так і не пабачылі...

**Гутарыў Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**
**Фота з прыватнага архіва Аляксандра ВІНЧЭЎСКАГА.**

Зямельнае пытанне

# «У пагоні за незаконным прыбыткам вы рызыкуеце страціць свой кавалак зямлі»

**За два дні Генпракуратура выявіла ў Мінску 15 фактаў нямэтавага выкарыстання зямельных участкаў.**

«Дзяржава дае зямельныя ўчасткі для будаўніцтва жылых дамоў, а некаторыя несумленныя грамадзяне нелегальна размяшчаюць там станцыі тэхнічнага абслугоўвання аўтамабіляў, вытворчыя памяшканні і офісы», — абураецца **начальнік аддзела па наглядзе за выкананнем правоў і свабод грамадзян Генеральнай пракуратуры Беларусі Павел РАДЗІВОНАЎ.**

Больш за ўсё такіх правапарушэнняў выяўлена ў Цэнтральным і Фрунзенскім раёнах сталіцы.

— Напрыклад, на вуліцы Ржавецкай, што паблізу рынка Ждановічы, знаходзіцца ангар (плошчай 350 м$^2$), які прылягае да індывідуальнага жылога дома, — расказвае Павел Радзівонаў. — На тэрыторыі гэтага тэхнічнага памяшкання размешчана нелегальная мэблевая вытворчасць і склад мотатэхнікі. На момант праверкі там было каля 300 матацыклаў і мапедаў. У вытворчае памяшканне быў ператвораны і індывідуальны жылы дом, які размяшчаецца на перавулку Чарвякова ў пасёлку Навінкі. Там на плошчы звыш 500 м$^2$ знаходзілася станцыя тэхнічнага абслугоўвання аўтамабіляў. У дзень праверкі мы налічылі там ні многа ні мала 50 аўтамабіляў. Я перакананы, што далёка не кожная станцыя можа пахваліцца такім вялікім памяшканнем для абслугоўвання аўто. Акрамя таго, названыя месцы складана адрозніць ад звалкі, побач з якой даводзіцца жыць гаспадарам суседніх дамоў.

Пракурорская праверка выявіла таксама факты будаўніцтва шматкватэрных дамоў на ўчастках, якія выдзелены пад індывідуальнае будаўніцтва. Такія парушэнні выяўлены, у прыватнасці, на тэрыторыі Першамайскага і Савецкага раёнаў горада Мінска.

— Да такой сітуацыі з выкарыстаннем зямельных участкаў, выдзеленых пад будаўніцтва індывідуальнага жылля ў Мінску, прывяло патуранне мясцовых уладаў, — адзначыў Павел Радзівонаў. — Я не паверу, што кіраўнікі адміністрацый і прадстаўнікі розных кантралюючых органаў не ведалі пра выяўленыя парушэнні зямельнага заканадаўства. Не заўважыць падобных фактаў, аб'язджаючы горад па працоўных абавязках, проста немагчыма. Хутчэй, чыноўнікі проста заплюшчвалі на іх вочы.

Паводле слоў работніка Генеральнай пракуратуры, адміністрацыі раёнаў, на жаль, практычна не выкарыстоўваюць свае права канфіскоўваць зямельныя ўчасткі, якія выкарыстоўваюцца не па прызначэнні.

— Мы ж, у сваю чаргу, будзем на гэтым настойваць, — падкрэсліў Павел Радзівонаў. — Акрамя таго, пракантралюем, каб былыя ўладальнікі не пазбеглі адміністрацыйнай адказнасці. Іх незаконная дзейнасць, мяркую, моцна ўдарыць па кішэні. Не выключаю, што ў дачыненні да некаторых прадпрымальнікаў, якія ажыццяўлялі сваю незаконную дзейнасць на зямельных участках, выдзеленых пад індывідуальнае будаўніцтва, будуць заведзены крымінальныя справы. Апошняе слова — за судом.

Генпракуратура ж працягне праверкі нямэтавага выкарыстання зямельных участкаў не толькі ў Мінску, але і ва ўсіх рэгіёнах рэспублікі. Такім чынам, паводле слоў Паўла Радзівонава, многія грамадзяне рызыкуюць у пагоні за незаконным прыбыткам страціць свой кавалак зямлі.

**Сёлета па ўсёй краіне пракуратура правяла каля 340 праверак выканання зямельнага заканадаўства. У выніку гэтых праверак дзяржаўны бюджэт папоўніўся прыблізна на 600 мільёнаў рублёў, у дачыненні да трох правапарушальнікаў заведзены крымінальныя справы, каля 200 чалавек прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці.**

**Надзея ДРЫЛА.**

# Зэканомяць на энергіі. А калі на здароўі?

**З 1 верасня ў 27 краінах Еўрасаюза ўвойдзе ў сілу забарона на выраб і продаж лямпачак напальвання. Гаворка пакуль ідзе пра лямпачкі магутнасцю ў 100 ват. А да канца 2012 года плануецца пазбавіцца і ад 75-ватных. На змену ім прыйдуць энергазберагальныя лямпачкі. Усё гэтыя крокі абумоўлены энергазберажэннем.**

Цяперашнія традыцыйныя лямпачкі пераўтвараюць у святло толькі каля 5 працэнтаў энергіі, астатняе — у непатрэбнае цяпло. Выпуск энергазберагальных лямпачак наладжаны на РУП «Брэсцкі электралямпавы завод», але і ад вытворчасці звыклых пакуль ніхто адмаўляцца не збіраецца. У большасці спажыўцоў пераважаюць электрабытавыя і асвятляльныя прыборы, разлічаныя менавіта пад лямпачку напальвання. У найбліжэйшы час не толькі наша краіна, але і шэраг колішніх савецкіх рэспублік, наўрад ці цалкам адмовяцца ад іх выкарыстання.

Згодна з паведамленнямі са спасылкай на англійскіх экспертаў аховы здароўя, энергазберагальныя лямпачкі могуць нанесці сур'ёзную шкоду адчувальнай скуры. Асабліва адзначаецца ўплыў на пяшчотную скуру немаўлят. Святло энергазберагальных лямпачак можа стаць прычынай мігрэняў і нават прыступаў эпілепсіі. На сёння ёсць два віды энергазберагальных лямпачак: калагенавыя і флуарэсцэнтныя. Найбольш небяспечныя з іх, паводле меркавання экспертаў, апошнія. Спецыялісты раяць выключыць з продажу лямпачкі гэтага віду, разлічаныя на 100 ват. Лямпачкі энергаёмістасцю 40 і 60 ват яны лічаць менш шкоднымі. Паведамляецца, што раней вучоныя ўжо заяўлялі пра тое, што такія лямпачкі могуць стаць прычынай праблем са здароўем, аднак цяпер сталі вядомыя новыя падрабязнасці іх уплыву на скуру чалавека.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

aquabel

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА ПУТЕМ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

**ЗАО «Выставочный центр Аквабел» Минский район проводит аукцион по продаже следующих объектов недвижимого имущества:**

| № лота | Наименование объекта | Адрес объекта | Инвентарный номер | Год постройки | Общая площадь, м.кв. | Начальная стоимость объекта, бел. руб. с НДС | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Изолированное помещение (дополнительная информация: предлагается помещение для офиса или банковского учреждения) | Минский р-н, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, пом. 1 | 600/D-52876 | 2005 | 264,3 | 1 420 000 000 | 20 000 000 |
| 2. | Капитальное строение (дополнительная информация: предлагается спортивно-оздоровительный центр (бассейн, спортзал, бани, бар) вместе с оборудованием и благоустроенной огороженной территорией с автостоянкой площадью 0,8044 га) | Минский р-н, д. Боровая | 600/С-44359 | 2004 | 3021,5 | 14 000 000 000 | 20 000 000 |
| 3. | Изолированное помещение (дополнительная информация: предлагается помещение общественного питания (ресторан) вместе с оборудованием) | Минский р-н, район д. Боровая, 1-102 | 600/D-29444 | 2000 | 553,6 | 2 544 000 000 | 20 000 000 |
| 4. | Капитальное строение Технический корпус № 1 (дополнительная информация: предлагается отапливаемое специализированное складское здание с рампой и благоустроенной территорией) | Минский р-н, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги | 600/С-109478 | 2008 | 1430,3 | 5 300 000 000 | 20 000 000 |
| 5. | Зерносушитель (дополнительная информация: предлагается капитальное строение с земельным участком для его эксплуатации и обслуживания площадью 1,7611 га) | район д. Городище Минского р-на | 600/С-43150 | 1976 | 695,1 | 500 000 000 | 10 000 000 |

**Условия проведения аукциона:**

Организатором аукциона и продавцом является Закрытое акционерное общество «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район, адрес: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административное здание, комната 302.

Торги состоятся 30.09.2009 года в 10.00 по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административное здание, 3 этаж, зал совещаний.

Шаг аукциона – **5 %** начальной стоимости объекта.

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица любой формы собственности, а также иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические и физические лица, а также граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительства за границей).

**Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы:**

заявление на участие в аукционе и об ознакомлении с объектом;

заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесения задатка в белорусских рублях;

юридическими лицами – резидентами Республики Беларусь – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

представителями физических лиц – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность;

юридическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

юридическими и физическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

представителями юридических и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

Задаток перечисляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет ЗАО «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район № 3012204960010 в ф-ле Минская городская дирекция ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, код 153001963, УНН 600438617.

Задаток возвращается всем участникам аукциона, кроме участников аукциона, выигравших торги, в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона или с момента регистрации продавцом (организатором аукциона) отказа от участия в аукционе. Участнику аукциона, выигравшему торги, задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах.

Победитель аукциона заключает договор купли-продажи в течение 5 (пяти) банковских дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. В случае уклонения или отказа от заключения договора задаток победителю аукциона не возвращается.

Оплата стоимости приобретенных на аукционе объектов осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях в течение 10 банковских дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.

Заявки на участие в аукционных торгах принимаются до **29.09.2009 г. до 14.00** включительно по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административное здание, 1 (первый) этаж, комната 103.

**Тел. (017)237 91 32, (029)757 12 02.**

# БЫЦЬ ГАСПАДАРОМ

## ІМКНЕЦЦА НАВУЧЫЦЬ ЦЭНТР ПАДТРЫМКІ СЕЛЬСКАГА РАЗВІЦЦЯ



**Гэта скарочаная назва ўстановы, а поўнасцю яна называецца Мясцовы фонд «Цэнтр падтрымкі сельскага развіцця і прадпрымальніцтва Столінскага раёна», і працуе цэнтр не з фермерамі альбо буйнымі сельгасвытворцамі, а найперш са звычайнымі вяскоўцамі — уладальнікамі ўласных падсобных гаспадарак. Не выпадкова такая арганізацыя ўтварылася на Століншчыне: уласныя гаспадаркі тут развітыя да ўзроўню таварнай вытворчасці, у многіх яны сталі крыніцай асноўнага прыбытку. Шмат гаспадароў займаюцца агуркамі, але нямала на вясковых агародах расце таксама морквы, капусты, бульбы. Некаторыя спрабуюць сябе ў свінагадоўлі, гадуюць буйную рагатую жывёлу на малако і мяса. Такіх гаспадароў імкнецца падтрымаць цэнтр — дапамагчы метадычнымі парадамі, навуковай кансультацыяй, а бывае, і практычна дапамагае.**

### Гісторыя ўзнікнення

Яна звязаная з ліквідацыяй наступстваў найбуйнейшай тэхнагеннай катастрофы XX стагоддзя — чарнобыльскай аварыі. Людзі з многіх краін імкнуліся дапамагчы пацярпелым раёнам. На Століншчыну сталі прыязджаць спецыялісты і прадстаўнікі адпаведных гуманітарных арганізацый. Яшчэ паўтара дзясятка гадоў таму разам з супрацоўнікамі Інстытута глебазнаўства і аграхіміі АН нашай краіны яны паспрабавалі паказаць людзям, як на забруджаных землях можна вырошчваць чыстую прадукцыю. Тая першая праграма называлася «Этас», потым яна ўдасканальвалася, развівалася і паступова перарастала ў маштабны беларуска-французскі праект «CORE-Agri», які ў падрабязным перакладзе гучыць як «Устойлівае эканамічнае і сельскагаспадарчае развіццё тэрыторый, што пацярпелі ад чарнобыльскай аварыі». У канцэпцыю сваёй праграмы яе заснавальнікі паклалі прынцыпы стварэння ўмоў для руху ініцыятывы «знізу ўверх», ашчаднага стаўлення да навакольнага асяроддзя, жыцця ў гармоніі з прыродай, а не выціскання з яе ўсіх сокаў. Такім чынам, паводле задумкі аўтараў праграмы, трэба выхоўваць не толькі агратэхнічную культуру гаспадароў, але і спрыяць нараджэнню новага мыслення адносна прыроды і свайго месца ў ёй.

Гэта, так бы мовіць, тэарэтычны аспект. Каб было зразумела, адкуль узяліся карані і фундатары добрай справы. А на практыцы ўсё выглядала прыкладна так: прыязджалі спецыялісты-валанцёры і разам з нашымі спецыялістамі ішлі ў вёску, размаўлялі з людзьмі. Для пачатку прапаноўвалі ім паспрабаваць новыя тэхналогіі па вырошчванні бульбы. Насенне, сродкі абароны раслін удзельнікам эксперыменту выдаваліся бясплатна. Спачатку людзі насцярожана ставіліся да чужакоў, але на выручку прыходзілі сельскія Саветы, установы культуры. Калі для сустрэч выдзялялі памяшканне, то і вяскоўцы больш веры давалі гасцям, чым у выпадку размовы, умоўна кажучы, каля студні. І вось знайшліся групы добраахвотнікаў у Альманах, Гарадной, Белавушы, Церабяжове — вёсках, якія, дарэчы, найбольш пацярпелі ад аварыі. Бульбу тую ўзялі, на сваіх агародах вырасцілі і ўраджай атрымалі нашмат больш, чым у суседзяў. Як няцяжка зразумець, пасля першага ўдалага доследу, ахвотнікі знаходзіліся больш актыўна. Вось так паступова, ад вёскі да вёскі, ішла пагалоска пра тое, што ёсць нейкія людзі, да якіх можна звярнуцца па дапамогу. І ўжо бывалі выпадкі, што вяскоўцы самі знаходзілі кансультантаў, каб папытаць нейкай парады. Так паступова выспявала ідэя стварыць арганізацыю, якая б працавала на пастаяннай аснове. Да рэалізацыі ідэі ішлі крок за крокам. Раіліся з людзьмі, праводзілі ўстаноўчыя сходы, імкнуліся, каб ініцыятыва не насаджалася зверху, а зыходзіла ад саміх гаспадароў. Фонд зарэгістравалі ў сакавіку 2006 года. Яго заснавальнікамі ў шэрагу іншых выступілі райвыканкам і некаторыя столінскія прадпрыемствы, звязаныя з перапрацоўкай сельгаспрадукцыі.



Гаспадыня з Альманаў сярод агуркоў карнішонаў у адкрытым грунце.

### Праграмы і праекты

Дырэктар Цэнтра сельскага развіцця Віктар Велясніцкі падрабязна расказаў пра кароткую, але насычаную фактамі і падзеямі гісторыю ўстановы. Варта адзначыць, што асноўнай крыніцай фінансавання Цэнтра сельскага развіцця да гэтай пары з'яўляюцца гранты замежных фундатараў. На кожны праект пішацца абгрунтаванне, а фундатар, калі знаходзіць яго карысным, дае сваё «дабро» ў выглядзе канкрэтнай сумы. Вельмі важна, каб ініцыятыва нарадзілася ў асяродку гаспадароў уласных сядзібаў.

Ужо рэалізаваны цэлы шэраг праектаў па паляпшэнні агратэхнікі вырошчвання асноўнай культуры тутэйшых мясцінаў — агурка. Пад эгідай фонду група гаспадароў выязджала для вывучэння досведу ў суседнюю Украіну, штогод ахвотныя наведваюць рэспубліканскую выставу «Белагра». Вынікам паездак, семінараў стала выкарыстанне многімі найноўшых відаў насення, гербіцыдаў, прыстасаванняў для кропельнага арашэння раслін, генератараў гарачага і халоднага туманаў. У многіх вёсках гаспадары падалі ідэю вырошчваць познія клубніцы — для паляпшэння севазвароту і атрымання дадатковага прыбытку.

### Аперацыя «Чыстая вада»

Варта адзначыць, што фінансавую падтрымку лягчэй знаходзяць сацыяльныя праекты. Прыкладам рэалізацыі такога праекта можна назваць кампаніі па чыстцы калодзежаў ветэранам, пенсіянерам. Ініцыятыва ўзнікла ў вёсцы Альманы. Санітарныя службы даўно звярталі ўвагу жыхароў на тое, што аналізы калодзежнай вады фіксуюць значнае перавышэнне дозы нітратаў. А прычынай такога становішча спецыялісты называюць адсутнасць рэгулярнай прафілактычнай ачысткі калодзежаў. Першым заходам на выдзеленыя грошы ўдалося пачысціць і прывесці ў парадак 15 калодзежаў. Тады многія жыхары Альманаў сталі выказваць пажаданне таксама стаць удзельнікамі праграмы. Яны гатовы былі часткова ўкласці свае грошы ў патрэбную справу. Больш за тое, было вырашана не прыцягваць падрадную арганізацыю, як было спачатку, а наняць работнікаў з ліку вяскоўцаў. Так і зрабілі, і работа абышлася танней. Акрамя таго, жыхары самі ўнеслі пэўную суму грошай. І за другім разам ужо ўдалося адрамантаваць 25 калодзежаў. Помпу, якую набылі для адпампоўвання вады, паводле рашэння фундатара, перадалі сельскаму Савету. Цяпер старасты вёсак будуць выдаваць агрэгат таму, хто самастойна або ў суполцы з суседзямі захоча пачысціць свой калодзеж.

Віктар Велясніцкі адзначае, што ў сваіх справаздачах аб выкарыстанні сродкаў гранта яны праўдзіва распавядаюць не толькі пра станоўчыя вынікі кампаніі, але і пра хібы. Так было і ў выпадку з калодзежамі. Некаторыя гаспадары «першай хвалі» рамонту засяродзіліся не на ўласна ачыстцы вады, а на паляпшэнні эстэтычнага выгляду калодзежа. Другі раз з вяскоўцамі доўга і падрабязна гутарылі, тлумачылі значэнне для здароўя чыстай вады. І атрымалася, што на памылках навучыліся.

### Другі дом

Сярод удалых сацыяльных праектаў можна, безумоўна, назваць стварэнне цэнтра дзённага знаходжання дзяцей у Рубельскай сярэдняй школе. Рубель — вёска вялікая. Заняткі ў школе праходзяць у дзве змены. Але, як і паўсюль, у вёсцы ёсць сем'і, дзецям з якіх не хапае ўвагі, яны часта трапляюць у цяжкія жыццёвыя сітуацыі. Што гэта азначае? У Рублі жывуць людзі ў асноўным заможныя. Сваім дзецям яны купляюць камп'ютары, забяспечваюць ім заняткі па інтарэсах. А вось школьнікі, якія такой магчымасці не маюць, адчуваюць сябе абдзеленымі. Для іх і стваралі цэнтр. На грошы праекта набылі мэблю, камп'ютар, музычны цэнтр, розныя гульні для заняткаў і развіцця. У цэнтры ладзіліся шматлікія сустрэчы. І дзеці з задавальненнем пайшлі туды. Настаўнікі расказалі, што адзін хлопчык з праблемнай сям'і, які быў надзвычай замкнёным, раптам раскрыў свой талент — заспяваў.

Дзеці з задавальненнем сустракаліся з супрацоўнікамі міліцыі, прафесійнымі псіхолагамі, дзяліліся праблемамі, атрымлівалі парады. Адным словам, цэнтр стаў запатрабаваным. Але праект закончыўся і фундатары гатовыя перадаць усю набытую маёмасць школе — з той умовай, што добрая справа будзе працягвацца.

### Утылізацыя шкоднай плёнкі

За час работы Столінскага цэнтра сельскага развіцця ў 10 населеных пунктах рэалізавана або знаходзяцца ў стадыі рэалізацыі 17 праектаў. Адзін з іх прадугледжвае ўтылізацыю плёнкі. Уласныя падсобныя гаспадаркі раёна на сваіх цяпліцах выкарыстоўваюць каля 700 тон плёнкі ў год. Потым яна спальваецца. Апошняе наносіць урон як здароўю людзей, так і прыродзе. Ідэя таксама нарадзілася спантанна ў асяродку гаспадароў вёскі Белавуша. Першым падыходам да яе рэалізацыі стала правядзенне шырокай падрыхтоўкі грамадскай думкі. З дапамогай школьнікаў у кожную паштовую скрыню вяскоўцаў былі кінуты ўлёткі аб шкодзе спальвання поліэтыленавай плёнкі. Потым сталі размаўляць з уладальнікамі цяпліцаў. Абсалютная большасць з іх гаварылі, што гатовыя прывозіць і здаваць адпрацаваную плёнку, калі будзе куды. Пытанне пра аплату за старую плёнку ўзнімаў толькі кожны трыццаты суразмоўца. Такім чынам, кансультанты цэнтра прыйшлі да высновы, што людзі гатовыя праявіць гаспадарскую і грамадзянскую свядомасць. У Мінску знойдзена фірма, якая дала згоду прыязджаць і забіраць адпрацаваны матэрыял сваім транспартам, праўда, толькі ў спрасаваным выглядзе. Засталося толькі ўзвесці лёгкі ангар для часовага захоўвання плёнкі і набыць прэс.



### Будучы кааператыў

Калі ўсё будзе добра, хутка ў Велямічах з'явіцца першы кааператыў уладальнікаў уласных падсобных гаспадарак. Усе перадумовы для гэтага ёсць. А галоўнае, ёсць людзі, якія зарэкамендавалі сябе дружнай камандай, хоць кожны з іх вядзе асобную гаспадарку. Яшчэ раней яны па ўласнай ініцыятыве адрамантавалі дах сельскага клуба, дапамаглі яго загадчыцы навесці парадак у продажы квіткоў на дыскатэкі. А да гэтага добраўпарадкавалі стары закінуты дамок рыбака на беразе вадаёма. Гэта азначае, што практыка сумеснай работы ў групы людзей (ад 25 да 45 гадоў) ёсць. У іх ёсць таксама добры асабісты кантакт, яны разам адпачываюць, разам адзначаюць святы.

А кааператыў абяцае палегчыць многія іх клопаты. Яны стануць юрыдычнай асобай, значыць, атрымаюць магчымасць купляць, напрыклад, насенне, сродкі абароны раслінаў за безнаяўны разлік, што намнога танней, чым за наяўныя грошы. Далей: кааператывам можна падысці да паляпшэння збыту сваёй прадукцыі. Цяпер яны здаюць прадукцыю перакупшчыкам, якія дыктуюць цану. І калі летась у самы сезон тыя самыя перакупшчыкі вызначылі цану на агуркі — 100 рублёў за кілаграм — ім усё адно здавалі. Так, я не памылілася. Менавіта — 100 рублёў атрымлівалі вытворцы за агуркі ў той час, як мы з вамі ў вялікіх гарадах набывалі той жа кілаграм за дзве тысячы. Дык вось кааператыў зможа хутчэй зарыентавацца, скажам, наняць транспарт, і крыху збіць цану на рынках сталіцы альбо Брэста. Па адным з абаротамі сваіх гаспадарак цяперашнія гаспадары нічога не зробяць.

Цяпер рыхтуюцца дакументы, вывучаецца заканадаўчая база. Багатая практыка кааперацыі фермераў, дробных гаспадарак ёсць у Францыі, іншых краінах Еўропы. Там фермеры суполкай купляюць камбайны, трактары, іншую тэхніку. Пазнаёміцца з літаратурай, дзе апісаны гэта практыка, паглядзець на набыткі суседзяў з блізкага замежжа дапамог веляміцкім гаспадарам Цэнтр падтрымкі сельскага развіцця.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Столінскі раён.*




## СЛОВА НЕ ВЕРАБЕЙ...

Было гэта даўно, яшчэ пры маім студэнцтве — на Савецкай плошчы, ля помніка, аўтобус спыняўся. Сотні разоў я садзіўся там, сотні разоў выходзіў — і хоць бы што. А тут — няма транспарту і няма. У чаканні стаў помнік разглядаць, надпіс перачытваць: «Воінам-вызваліцелям другога і трэццяга беларускіх франтоў...».

Далей не чытаю, не магу — штосьці перашкаджае. А што? Так і ёсць — слова «трэццяга» напісана праз два «ц»! Памылка! А з іншага боку — гэта ж помнік! Не дурні ж на ім пісалі! Дык, можа, дзве «ц» і патрэбныя?

Прыехаў дамоў, паглядзеў у падручнік — адна.

Раніцай ва ўніверсітэце падышоў да выкладчыка, патлумачыў сітуацыю — таксама кажа — адна.

Усё праверыўшы, рашыў выканаць свой грамадзянскі і прафесійны абавязак: пра памылку паведаміць у мясцовую газету.

З рэдакцыі дні праз тры прыходзіць паведамленне, што ліст накіраваны на рэагаванне ў гарвыканкам. Адтуль, з гарвыканкама (як паведамілі недзе праз месяц) — у жылкамунгас (і напэўна ж з нейкай рэзалюцыяй?). Была папера і адтуль. У ёй пісалася, што з нагоды майго вельмі слушнага ліста праведзена нарада...

Карацей, месяцаў праз пяць напружанай разумовай працы (абмеркаванняў, нарад, падрыхтоўкі дакументаў) ля помніка такі з'явіўся нейкі дзядзька ў куфайцы, падставіў драбіну, ускараскаўся па ёй наверх і адбіў недарэчнае, непатрэбнае «ц».

Адкуль выснова — каб зрабіць памылку, ні часу ні розуму не трэба, а вось каб выправіць...

**Віктар ВАРАНЕЦ,**
*г. Гродна*

## ШТО ТОЙ САЛДАТ, ШТО ГЭТЫ...

Гэта было ў далёкія ўжо 70-я гады. У нашым класе праходзіў сход — некалькі вучняў прымалі ў камсамол і, як водзіцца ў такіх выпадках, экзаменавалі, правяралі, ці вартыя: ці ведаюць статут гэтай арганізацыі, як арыентуюцца ў палітыцы, у грамадскім жыцці... У аднаго з кандыдатаў у камсамольцы, прынамсі, пытаюць:

— А хто камандуе Беларускай ваеннай акругай?

Хлопец пачырванеў, вачыма лыпае, маўчыць, бо што ж яшчэ застаецца рабіць, калі не ведаеш... Хіба падказкі слухаць? Дабразычліўцы з першых парт тут як тут — давай яму шаптаць:

— Тра-ццяк... Тра-ццяк...

І гэта — чыстая праўда, але ў нашай школе акурат з такім жа прозвішчам яшчэ і настаўнік быў, на сходзе прысутнічаў, на апошняй парце сядзеў. Вучань здзіўлена паглядзеў на яго і адказвае:

— Трацццяк... Уладзімір Паўлавіч.

Клас аж лёг ад рогату...

Разам з усімі смяяўся і настаўнік. Хоць яму, Уладзіміру Паўлавічу, можа, і ніякавата было ад таго, што не зрабіў ваеннай ці іншай кар'еры.

**Наталля КВІТКЕВІЧ,**
*г. Мінск*

## НЯПРОШАНАМУ ГОСЦЮ ЛЫЖКІ НЯМА

Вайна скончылася ў 45-м, але спакой настаў намнога пазней. Прынамсі ў нас па ваколіцах блукала многа розных банд, міліцыя ганялася за імі, а да зладзеяў рукі не даходзілі — дзейнічалі яны нахабна. Не, не забівалі, не рабавалі, але бралі ўсё, што толькі можна было, не шкадавалі ні ўдоў, ні сірот. А кемлівыя былі: на суседнім хутары ўкралі свінню, а каб гаспадар не зразумеў, куды павялі (па снезе), абулі яе ў лапці. Думалі, відаць, што вось іх — не абуе ніхто. І памыляліся!..

Усе ўдалыя аперацыі ў іх прынята было адзначаць — у хаце ў Рамана. А яна, тая хата, ды на дзве паловы падзелена, у другой — сям'я брата жыве, праз сенцы.

У сенцах столі не было. Гэта, напэўна, і прымусіла некага задраць галаву і, як на грэх, убачыць там падвешаны карук (страўнік свіны... Набіты мясам). Смаката ж! Рашылі, што заўтра паласуюцца. Далі Раману заданне прынесці драбіну...

Бяда чалавеку: прынясеш — паможаш украсці, ды ў каго — у роднага брата; не прынясеш — чаго добрага, паб'юць.

Думаў ён думаў, што рабіць, і пайшоў на раду.

— Прымі, — кажа брату, — схавай свой карук, а то зладзеі вока палажылі, заўтра з'ядуць.

— Не буду, — той адказвае, — ні прымаць, ні хаваць. Хай яны ім падавяцца!..

Але ж потым, відаць, адумаўся: залез на гарышча, зняў той карук, выбраў мяса, напхаў конскага памёту, зашыў і павесіў.

Вечарам назаўтра сышліся зладзюжкі, дасталі тую смакату, паселі навокал, налілі пад яе гарэлкі, разрэ...

Хваляй смуроду іх адкінула ад стала.

— Падмануў! — закрычалі... Але ж не хацелі, каб людзі пра гэта ведалі, каб з іх смяяліся, таму на «разборкі» нікуды не пайшлі. Думалі, усё неяк замнецца. Памыліліся.

**А.А. ЗЕЛЯНКЕВІЧ,**
*в. Мачуль, Столінскі раён*

## СХАВАЕШ... ЯК ШЫЛА Ў МЯШКУ

Мая залвіца — старэйшая мужава сястра — гумарыстка яшчэ тая, ведае проста безліч анекдотаў. А ўжо як расказвае... Мы, здараецца, проста ўпокат ляжым, бакі зрываем... Пытаемся потым: ну, дзе ты гэта вычытала, ну, хто ж гэта прыдумаў?!.

Залвіца кажа, што многія байкі прыдумваюць зэкі, а яшчэ больш — само жыццё. Вось, расказвае, едзе яна ў электрычцы з Мінска ў Маладзечна. Дзень будны, народу няшмат. На адной са станцый — маладая жанчына заходзіць, з хлопчыкам. Харошае дзіцятка, тутэйшае: вочкі сінія, твар бялявы, нос бульбінкай. Селі непадалёк. Маці малому тут жа куртачку расшпіліла, ён шапачку скінуў і на лаўку паклаў. А па вагоне скразняк гуляе — палова вокнаў адчынена.

— Надзень, а то прастынеш, — загадвае маці малому.

Той кажа:

— Не прастыну, — і шапачку тую пад сябе: сеў і сядзіць на ёй — пазірае. Маці зазлавалася. Дастала шапачку, нацягнула яму на галаву, стала строга казаць, што яго хваробы ёй ужо ў пячонках, што калі не будзе слухацца, то яна аддасць яго дзядзьку кантралёру, што... Малы пад гэты шум яшчэ раз скінуў шапку і на ўвесь вагон, лічы, як ляпне:

— Пайшла ты...

І сказаў, куды...

У такіх выпадках разумныя маці альбо змоўчваюць ці пераключаюць увагу на нешта іншае, каб дзіця забылася гэтае слова (калі яно выпадковае), альбо ўжо тлумачыць, што яно дрэннае, што харошыя дзеці так не гавораць. Гэта ж маладзіца — тым, хто блізка сядзеў — стала даводзіць, што яны з мужам людзі прыстойныя і ніколі не лаюцца, што гэта — з дзіцячага садка малы ўсё прыносіць — і розныя вірусы-інфекцыі, і брыдкія словы. Людзі згодна заківалі, сталі спачуваць. А адзін дзядок раптам кажа малому:

— Слухай, я не зразумеў, куды ты сваю маму паслаў? Што ж гэта за месцейка такое? Дзе яно?

Хлопчык насупіўся, задумаўся, трохі памаўчаў, а потым і адказвае:

— Я не ведаю, дзе, бо калі тата гэтак гаворыць, мама нікуды не ідзе, дома застаецца...

Вось і не вер пасля гэтага прыказцы, што дзіцятка вучыцца ўсяму, што бачыць у сваім даму.

**А. К.,**
*г. Маладзечна*

## РАБОТА НАД ПАМЫЛКАМІ

Было — пашчасціла мне патрапіць у сталіцу Літвы на 30-годдзе вызвалення яе ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Грандыёзнае свята — проста мора музыкі, песень, кветак, добрых слоў у адрас ветэранаў, мноства і знатных гасцей з усіх рэспублік Саюза...

Мітынг распачаў першы сакратар гаркама партыі. На рускай мове, каб было зразумела ўсім, гаварыў пра дружбу народаў, пра подзвіг Савецкай Арміі. А вось наступныя выступоўцы — прадстаўнікі інтэлігенцыі, рабочага класа — сталі гаварыць ужо па-свойму, па-літоўску, перакладчыкаў не было, таму госці з іншых рэспублік разгублена пераглядваліся, нічога не разумелі...

Выйсце, як і варта было чакаць, знайшлося, і было яно, як сякера пад лаўкай. Пад гром апладысментаў да мікрафона пайшоў былы камандуючы першым Прыбалтыйскім фронтам двойчы Герой Савецкага Саюза маршал Іван Хрыстафоравіч Баграмян. Рашучы, суровы падняўся ён на трыбуну, убачыў непадалёк транспарант: «Самый храбрый из армян — Баграмян», усміхнуўся студэнтам, якія яго трымалі, і загаварыў... па-армянску.

Цяпер ужо гаспадары свята, літоўцы, разгублена пераглядваліся паміж сабой, але ж, здаецца, разумелі, чаму спадар Баграмян гаварыў на сваёй мове.

Таму вечарам у адным з найлепшых рэстаранаў падобных непаразуменняў ужо не было: усе тосты прамаўляліся па-руску: дружбу між народамі замацоўвала руская гарэлка і армянскі каньяк.

**Мікалай АМЕЛЬЧАНКА,**
***г. Мінск***

*Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Антыкрызіснае будаўніцтва

# Жыллё — людзям, стымул — эканоміцы

**Будаўніцтва жылля павінна стаць лакаматывам, які выцягне нацыянальную эканоміку з крызісных з'яваў. Гэтай сферы надаецца вялікая ўвага: у Магілёўскім аблвыканкаме прааналізавалі ход жыллёвага будаўніцтва ў рэгіёне.**

**Лічбы — цалкам паспяховыя:** будаўніцтва жылля за 7 сёлетніх месяцаў у параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года павялічылася на трэць (+34,2 %). Уведзены ў эксплуатацыю болей за 330 тысяч квадратных метраў жылля, што складае 58 % гадавога задання.

Урад паставіў перад рэгіёнамі задачу: за 9 месяцаў трэба выканаць 90 % гадавога плана, каб зрабіць задзел і на год будучы.

За недастатковыя тэмпы жыллёвага будаўніцтва найбольш крытыкавалі Бабруйск. Горад летась не выканаў задання па будаўніцтве, і сёлета не дацягвае да выканання рашэнняў Урада. Кіраўніцтва Бабруйска спасылаецца на аб'ектыўныя прычыны: на адсутнасць планаў дэталёвай планіроўкі раёнаў горада, неабходнасць праектавання.

— Будаўнікі цяпер працуюць у дзве-тры змены, — сказаў старшыня Бабруйскага гарвыканкама Дзмітрый Бонахаў — За год заданне па будаўніцтве жылля мы абавязкова выканаем. Будзе плюс 70 % да мінулага года.

**Індывідуальнае будаўніцтва жылля** — адзін з рэзерваў, аднак яно ідзе павольна. Цяпер у вобласці ёсць амаль 1400 заявак на будаўніцтва ўласных дамоў, прычым пераважная большасць з іх паступіла ад людзей, якія стаяць у чарзе на атрыманне жылля. Аднак далёка не ўсе заяўкі рэалізоўваюцца. У адных выпадках афармляюцца дакументы, у другіх — яшчэ няма рашэння выканкамаў, у трэціх — ідзе праектаванне, тэрміны якога сёння не заўсёды задавальняюць улады і людзей. Толькі дзясятая частка людзей, якія падалі заяўкі, можа цяпер прыступаць да будаўніцтва. Астатнія адкладуць будаўніцтва да наступнага сезона.

Ёсць пытанні па якасці будаўніцтва і культуры будоўляў, а таксама і па тэрмінах. У тым ліку за кошт расцягвання тэрмінаў і аўральнай працы напрыканцы **расце і кошт будаўніцтва.**

Квадратны метр новага жылля ў Магілёўскай вобласці летась складаў 912 долараў, у першым сёлетнім квартале — 997, а за першае паўгоддзе перасягнуў мяжу ў тысячу долараў і склаў 1067 долараў. Хоць намеснік старшыні аблвыканкама Леанід Шкрадзюк паведаміў, што паніжэнне цэнаў з красавіка на цэмент, жалеза-бетонныя і іншыя канструкцыі паменшыць і кошт будаўніцтва.

Яшчэ адна важная праблема — **будаўніцтва жылля гаспадарчым метадам прамысловымі прадпрыемствамі.** Заданне прамыслоўцы атрымалі на наступны год, аднак ужо сёлета трэба зрабіць усю падрыхтоўку — стварыць жыллёва-будаўнічыя кааператывы, атрымаць зямельныя ўчасткі для будаўніцтва, рабіць праектаванне. Праўда, толькі лічаныя са спісу прадпрыемстваў актыўна заняліся жыллёвым будаўніцтвам.

Між тым, улады лічаць, што цяпер ёсць ідэальны час для таго, каб забяспечыць жыллём сваіх працаўнікоў і скараціць чэргі на жыллё. Менавіта будаўніцтвам жылля для саміх сябе мяркуецца заняць людзей, якія цяпер з-за крызісных праблем маюць няпоўны працоўны тыдзень альбо адпраўляюцца ў вымушаныя адпачынкі. Напрыклад, на «Белшыне», якая сёння адчувае значныя праблемы са збытам прадукцыі, у чарзе на жыллё стаяць каля дзвюх тысяч чалавек.

— Людзі, якія не занятыя ў вытворчым працэсе, могуць навучыцца будаўнічай прафесіі і будаваць сабе жыллё! — заклікаў дырэктараў прадпрыемстваў да большай ініцыятывы старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік.

Кіраўнік вобласці таксама зазначыў, што «крызісу ў сферы будаўніцтва не павінна быць і яго няма». Будаўнічыя арганізацыі ў цяперашніх эканамічных умовах адчуваюць сябе больш камфортна нават за прамысловыя прадпрыемствы, і гэта трэба выкарыстоўваць на карысць эканомікі краіны: новае жыллё для людзей па ланцугу забяспечыць працай і заробкам іншых.

**Ілона ІВАНОВА.**

## Аматары ціхага палявання памераюцца кошыкамі на грыбным чэмпіянаце

**Чэмпіянат па зборы грыбоў упершыню пройдзе ў Полацкім раёне, паведаміў карэспандэнту БЕЛТА намеснік старшыні Полацкага райвыканкама Пётр ПЯТКЕВІЧ.**

Месцам правядзення спаборніцтва выбрана вёска Дрэтунь і вялікі лясны масіў, які прылягае да яе. Тутэйшыя навакольныя мясціны даўно лічацца ў палачан і навапалачан негалоснай грыбной сталіцай. Кажуць, што на аматараў ціхага палявання з абодвух гарадоў і прылеглых вёсак дароў лесу хапае з лішкам. На старт 29 жніўня ў 7 гадзін раніцы выйдуць 80 камандаў: работнікі малаказавода, настаўнікі, урачы, работнікі райвыканкама. Прайшоўшы інструктаж і азнаёміўшыся з умовамі чэмпіянату, азартныя грыбнікі адправяцца ў лес. На збор дароў ім дадзена ўсяго тры гадзіны.

Кампетэнтнае ў грыбных справах журы, дарэчы, выбранае з ліку саміх удзельнікаў, вызначыць чэмпіёна і пераможцаў у некалькіх намінацыях.Арганізатарам незвычайнага чэмпіянату выступілі прафкамы ўстаноў адукацыі і аховы здароўя, райвыканкам, грамадскія арганізацыі раёна.

Чэмпіянаты па зборы лясных дароў даволі папулярныя ў Еўропе. У Фінляндыі спаборнічаюць у зборы не толькі грыбоў і ягад, але нават лясных кветак, а вось у Літве праходзіць чэмпіянат па начным зборы грыбоў.


# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## ОБЩЕСТВО С ДОПОЛНИТЕЛЬНОЙ ОТВЕТСТВЕННОСТЬЮ «ЭКОНОМИКА И ПРАВО»

**220005, г. Минск, ул. Гикало, д. 1, к. 300.**
**Режим работы:** с 09.00 до 18.00, перерыв с 13.00 до 14.00.
**Телефон приемной:** 211 30 90, тел. 288 26 01, 670 52 70 (Велком).

Зарегистрировано решением Мингорисполкома № 149 от 10 февраля 2000 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 101192384.

Выполняя функции заказчика, Обществом построен и введен в эксплуатацию жилой дом, расположенный по адресу: г. Минск, ул. Червякова, 61.

Общество осуществляет строительство объекта «4-секционный 9-этажный жилой дом с подземной встроенно-пристроенной одноуровневой автостоянкой для автомобилей и встроенными нежилыми помещениями на 1-ом этаже (не относящийся к домам повышенной комфортности) по улице Червякова в г. Минске».

Количество жилых помещений жилого дома – 160, количество машино-мест – 98. Жилой дом оборудован лифтами грузоподъемностью 630 кг и мусоропроводами. В квартирах предусмотрены остекленные лоджии.

Оконные блоки и балконные двери жилой части предусматриваются из деревянного профиля, встроенных помещений первого этажа – из ПВХ-профиля.

Внутренняя отделка (мест общего пользования): потолки – покраска акриловой краской; стены и перегородки – защитно-полимерный состав, покраска акриловой краской; покрытие пола – плитка керамическая с эффектом противоскольжения. В квартирах и встроенных помещениях окончательная отделка и покрытие пола проектом не предусматриваются.

Наружная отделка – покраска фасадными красителями, облицовка вибропрессованными блоками (1-й этаж).

Проектом предусмотрено: устройство подъездов (со стороны двора – по кровле встроенно-пристроенной автостоянки) и плоскостной парковки для автотранспорта на 10 машино-мест с покрытием из асфальтобетона; устройство противопожарной полосы укрепленной втапливанием щебня; устройство подпорных стенок и лестниц по рельефу; устройство тротуаров, дорожек и площадок с покрытием из мелкоразмерной бетонной плитки и асфальтобетона; устройство пониженного борта в местах пересечения проездов и пешеходных связей; размещение детских и хозяйственных площадок; посадка кустарников, устройство газонов, укрепление откосов посевом трав; восстановление покрытий после прокладки инженерных сетей; установка малых архитектурных форм.

Подземный неотапливаемый гараж-стоянка размещается под дворовым пространством и жилым домом и предназначен для хранения легковых автомобилей малого и среднего класса, работающих на бензине или дизельном топливе.

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические помещения и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков.

**Застройщиком получены:**

- акт выбора места размещения земельного участка, утвержденный 29 марта 2004 года Минским городским исполнительным комитетом;
- акт выбора места размещения земельного участка, утвержденный 19 декабря 2008 года Председателем Минского городского исполнительного комитета;
- разрешение на строительство Минского городского исполнительного комитета № 1553 от 09 июля 2009 года;
- свидетельство о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него № 500/313-6568 от 28.08.2009 года. Земельный участок площадью 0,7907 га;
- заключение ДРУП «Госстройэкспертиза по г. Минску» по проекту № 1038а-8-2009 от 23 июля 2009 года (подготовительный период);
- заключение ДРУП «Госстройэкспертиза по г. Минску» по проекту № 1038-8-2009 от 23 июля 2009 года;
- государственная экологическая экспертиза объекта проведена в составе проекта «4-секционный 9-этажный жилой дом с подземной встроенно-пристроенной одноуровневой автостоянкой для автомобилей и встроенными нежилыми помещениями на 1-ом этаже (не относящийся к домам повышенной комфортности) по ул. Червякова в г. Минске»;
- договор строительного подряда № 171-1 от 20 июля 2009 года с ОАО «Стройтрест № 35»;
- разрешение органа государственного строительного надзора № 2-209Ж-079/09 от 30.07.2009 года на производство строительно-монтажных работ.

**Начало строительства** – сентябрь 2009 года.

**Окончание строительства** – I квартал 2012 года.

Стоимость строительства 1 м$^2$ жилых помещений в текущих ценах составляет: при оплате 100 % стоимости квартиры – 1200 долларов США, при первоначальном взносе 50 % – 1250 долларов США, при первоначальном взносе 30 % – 1300 долларов США по курсу НБ РБ на день заключения договора. Стоимость строительства одного машино-места в текущих ценах составляет 25 000 долларов США по курсу НБ РБ на день заключения договора. Стоимость строительства 1 м$^2$ нежилых помещений в текущих ценах составляет: при оплате 100 % стоимости – 2200 долларов США, при первоначальном взносе 50 % – 2650 долларов США по курсу НБ РБ на день заключения договора.

Предметом договора будет являться строительство жилого и/или нежилого помещения.

**Предполагаемый срок ввода жилого дома в эксплуатацию** – март 2012 года.

| Звоните: | Приходите: |
| --- | --- |
| (017)211 30 90<br>(017)288 26 01<br>(029)670 52 70 | ул. Гикало, 1, к. 300<br>г. Минск, 220005<br>Республика Беларусь |



## РУП «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 29 сентября 2009 г. в 15.00 по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54, состоится АУКЦИОН по продаже имущества, принадлежащего ликвидируемому предприятию ОАО «Весоприбор», в составе следующих лотов:

| | |
| --- | --- |
| Лот № 1 | **Комплекс зданий, сооружений и оборудования, расположенный по адресу: г. Бобруйск, ул. Крупской, 2, в составе:**<br>**- кап. строение с инв. № 710/С-58314 (здание цеха сварных конструкций) пл. 2039,1 кв.м, с сооруж.: забор (ж/бет) пл. 28 м$^2$, забор (ж/бет) пл. 113 м2, забор (кирпич) пл. 87 м$^2$, ворота (метал) пл. 15 м$^2$, мощение (бетон) пл. 221 м$^2$;**<br>**- кап. строение с инв. № 710/С-54309 (здание склада ГСМ-2) общей площадью 12,4 кв.м;**<br>**- кап. строения с инв. № 710/С-54311 (канализационная сеть);**<br>**- кап. строение с инв. № 710/С-54310 (водопроводная сеть) протяженностью 23,1 м;**<br>**- в том числе: оборудование КТП 10/04-1 х 630 (инв № 1589), кран-балка г/п 3 т (инв № 752, 753, 782, 783), таль эл. г/п 2 т (инв № 1593), таль эл. г/п 3,2 т (инв № 1594), таль эл. г/п 5 т (инв № 1866, 1867).** |
| Лот № 2 | **Комплекс зданий, сооружений и оборудования, расположенный по адресу: г. Бобруйск, ул. Крупской, 2, в составе:**<br>**- кап. строение с инв. № 710/С-58317 (здание заготовительно-штамповочного цеха) пл. 1148,9 кв.м, с сооруж.: забор (ж/бет) пл. 12 м$^2$, забор (кирп) пл. 135 м$^2$, забор (метал.сетка) пл. 92 м$^2$, ворота (метал) пл. 11 м$^2$, калитка (метал) пл. 2 м$^2$, мощение (асф/бет) пл. 326,75 м$^2$; пути подкрановые;**<br>**- кап. строение с инв.№ 710/С-51530 (здание склада ГСМ) общей площадью 118,1 кв.м;**<br>**- кап. строение с инв.№ 710/С-54307 (здание склада) общ.пл. 81,6 кв.м;**<br>**- кап. строение с инв.№ 710/С-54308 (здание цеха голтовки) общ.пл. 111,7 кв.м;**<br>**- кап. строение с инв.№ 710/С-54306 (здание трансформаторной подстанции) общ. пл. 30,1 кв.м;**<br>**- в том числе: оборудование КТП 10/04-1 х 400 (инв № 62), кран-балка г/п 3 т (инв № 184а, 199, 191а), кран-балка г/п 5 т (инв № 485), таль эл. г/п 5 т (инв № 1222, 1223), кран-укосина г/п 0,5 т (инв № 1010).** |
| Лот № 3 | **Комплекс зданий, сооружений и оборудования, расположенный по адресу: г. Бобруйск, ул. Крупской, 2, в составе:**<br>**- кап.строение с инв. № 710/С-51527 (здание межцехового склада) пл. 516 кв.м, с сооруж.: забор (кирп) пл. 38 м$^2$, мощение (асф/бет) пл. 327 м$^2$; в том числе: таль эл. г/п 5 т (инв № 1035).** |
| Лот № 4 | **Кап.строение с инв. № 710/С-41497 (здание склада материалов и оборуд.) пл. 1 959,2 кв.м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Крупской, 2, с сооруж.: подкран. эстак. пл. 656 м$^2$, забор (кирп) пл. 187 м$^2$, мощение (асф/бет) пл. 654 м$^2$.** |

| Общие сведения | Лот № 1 | Лот № 2 | Лот № 3 | Лот № 4 |
| --- | --- | --- | --- | --- |
| Организатор торгов | РУП «Белтехинвентаризация», г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54, УНП 190305149 | | | |
| Начальная цена продажи, рублей без НДС | 718 574 050 | 560 911 658 | 169 582 573 | 505 812 426 |
| Размер задатка, рублей | 71 857 410 | 56 091 170 | 16 958 260 | 50 581 240 |
| Номер расчетного счета для перечисления задатка | Получатель платежа ОАО «Весоприбор» – р/с 3012000002968 в филиале 703 ОАО СБ «Беларусбанк» г. Бобруйск, код 760, УНП 700090810 | | | |
| Площадь земельного участка | **323/400 доли** земельного участка площадью 0,5106 га – кадастровый № 741000000009001750, правовой режим – аренда | **0,3418 га, в т.ч.:** 0,3365 га – кадастровый № 741000000009001751 и 0,0053 га – кадастровый № 741000000009001746, правовой режим – пост. пользование | 0,1051 га – кадастровый № 741000000009001752, правовой режим – пост. пользование | 0,2399 га – кадастровый № 741000000009001753, правовой режим – пост. пользование |
| Характеристика объектов | **здание цеха сварных конструкций** – 3-эт., кирп. с подвалом 1974 г.п, фундамент бутобет., перекрытия ж/б, кровля совмещ., инж. коммуникации; **здание склада ГСМ-2** – 1-эт., кирп., фундамент бет., перекрытия ж/б; кровля совмещ.; **здание заготовительно-штамповочного цеха** – 3-эт. кирп. 1974 г.п, фундамент бутобет., перекрытия ж/б; кровля совмещ.; **здание склада ГСМ** – 1-эт., кирп. 1972 г.п, фундамент бутовый, перекрытия ж/б; кровля совмещ:, **здание склада** – 1-эт., метал., полы бет.; **здание цеха голтовки** – 1-эт. кирп., 1972 г.п, фундамент бутобет., перекрытия ж/б; кровля совмещ:, **здание трансформатор. подстанции** – 1-эт кирп., фундамент бет., перекрытия ж/б; кровля совмещ:, **здание межцехового склада** – 1-эт. кирп., 1989 г.п, фундамент ж/б блоки, перекрытия ж/б; кровля совмещ.; **здание склада материалов и оборудования** – 2-эт., кирп. 1984 г.п, фундамент ж/б, перекрытия ж/б; кровля совмещ. | | | |
| Условия продажи | аукцион без условий | | | |
| Срок заключения договора купли-продажи | в течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | | |
| Условия оплаты | **определяются по согласованию Победителя торгов с Собственником имущества при заключении договора купли-продажи** | | | |
| **Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка** | | **по 28 сентября 2009 г. с 8.30 до 17.30 в адрес Организатора торгов** | | |

**Для участия в аукционе в адрес Организатора торгов необходимо предоставить:** заявление на участие; заверенную банком копию платежного поручения о внесении размера задатка, паспорт; **для резидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – доверенность представителю юр. лица (в случае необходимости таковой), копии и оригиналы учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации; **представителям физ. лиц** – нотариально заверенную доверенность; **для нерезидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена не ранее чем за 6 мес. до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; **юр. лицам и физ. лицам** – документ о состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (рус.) язык; **представителям юр. и физ. лиц** – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее наиболее высокую цену.** Задаток, внесенный Победителем, будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного имущества, остальным участникам будет возмещен в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. **Организатор торгов или Продавец вправе снять объект с торгов до объявления его проданным.**

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляет Победитель (Претендент на покупку) не позднее 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона на основании счет-фактуры, выдаваемой Организатором торгов до проведения аукциона.

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**



## РУП «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 28 сентября 2009 г. в 15.00 по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54, состоится АУКЦИОН по продаже имущества, принадлежащего ликвидируемому предприятию ОАО «Весоприбор», в составе Лота № 1:

| | | | |
| --- | --- | --- | --- |
| Наименование имущества, входящего в состав лота, в т.ч.: капитальные строения (здания, сооружения): | **кап. строение с инв. № 710/С-14162 (производственный корпус НМК) общ. пл. 5471,5 м$^2$** | **- кап. строение с инв. № 710/С-53537 (цех НМК) общ. пл. 2386,2 м$^2$;**<br>**- кап. строение с инв. № 710/С-56115 (гл. производственный корпус) общ. пл. 3860,5 м$^2$;**<br>**- кап. строение с инв. № 710/С-56122 (электросварочный цех) общ. пл. 2934,3 м$^2$;**<br>**- кап. строение с инв. № 710/С-41496 (компрессорная станция) общ. пл. 204,8 м$^2$;**<br>**- кап. строение с инв. № 710/С-53532 (цех голтовки) общ. пл. 86,3 м$^2$;**<br>**- кап. строение с инв. № 710/С-53538 (цех порошковой металлургии) общ. пл. 345,8 м$^2$;**<br>**- кап. строение с инв. № 710/С-53526 (гаражи) общ. пл. 166,2 м$^2$;**<br>**- кап. строение с инв. № 710/С-56118 (здание электромех. отделения) общ. пл. 179,5 м$^2$;**<br>**- кап. строение с инв. № 710/С-53530 (пристройка к участку ТНП) общ. пл. 352,3 м$^2$;**<br>**- кап. строение с инв. № 710/С-56117 (КПП) общ. пл. 28,6 м$^2$;**<br>**- кап. строение с инв. № 710/С-56121 (водопроводная сеть) протяженность 567,9 м;**<br>**- кап. строение с инв. № 710/С-56140 (канализационная сеть) протяженность 1493,5 м;**<br>**- кап. строение с инв. № 710/С-54302 (здание РБУ) пл. 55 м$^2$;**<br>**- ограждение пл. 221 м$^2$, ограждение пл. 149 м$^2$, ограждение пл. 206 м$^2$, ограждение пл. 30 м$^2$, ворота мех., ворота пл. 8 м$^2$, ворота пл. 11 м$^2$, мощение пл. 8130 м$^2$, мощение пл. 115 м$^2$.** | **кап. строение с инв. № 710/С-56113 (трансформаторная подстанция) общ. пл. 253,7 м$^2$** |
| многолетние насаждения: | яблоня – 30 единиц, груша, береза, каштан, алыча (инв. № 1320) | | |
| оборудование: | оборудование КТП 630/10 (инв. № 982), оборудование РУ-10Кв с КТП (инв. № 651), кран-балка г/п 1т (инв. № 1046, 1050), кран-балка г/п 3 т (инв. № 1007, 1008, 414), кран укосина г/п 0,5 т (инв. № 1358, 1481, 1482), таль эл. г/п 5 т (1573, 1574), таль эл. г/п 0,5 т (инв. № 1761), таль эл. г/п 0,25 т (инв. № 1515, 1568, 1569, 1571, 1572, 1570, 1274, 1273), пути подкрановые ГБВ 759000 (инв. № 17) протяженность 97 м, подвесной подкрановый путь (инв. № 55) протяженность 24 м, пути подкрановые (инв. № 62) протяженность 66 м, монорельсовые пути (инв. № 22) протяженность 12,4 м, монорельсовые пути (инв. № 1439) протяженность 160 м, теплоприемный пункт (инв. № 33), бетоносмесители 0,75 м$^3$ (инв. № 1810, 1809). | | |
| Адрес | г. Бобруйск, ул. Урицкого, 32 | г. Бобруйск, ул. Дзержинского, 14/1 | г. Бобруйск, ул. Дзержинского, 14 |
| Организатор торгов | РУП «Белтехинвентаризация», г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54, УНП 190305149 | | |
| Начальная цена продажи, руб. без учета НДС | 4 222 554 932 | | |
| Размер задатка, руб. | 422 255 493 | | |
| Номер расчетного счета для перечисления задатка | Получатель платежа ОАО «Весоприбор» – р/с 3012000002968 в филиале 703 ОАО СБ «Беларусбанк» г. Бобруйск, код 760, УНП 700090810 | | |
| Площадь земельного участка, га | **0,3486 га.** Кадастровый номер 741000000009001604. Правовой режим – право пост. пользования. | **2,2522 га.** Кадастровый номер 741000000009001696. Правовой режим – право постоянного пользования. | **0,0169 га.** Кадастровый номер 741000000006004981. Правовой режим – право пост. пользования. |
| Характеристика капитальных строений | **здание производственного корп. НМК** – 4-эт. кирп., фундамент бет., перекрытия ж/б, все коммуникации; **здание цеха НМК** – 2-эт., кирп., фундамент бет., перекрытия ж/б, все коммуникации; **здание главного производственного корпуса** – 2-эт., кирп., фундамент кирп., перекрытия ж/б, все коммуникации; **здание электросварочного цеха** – 1-эт., кирп., фундамент бут., перекрытия ж/б, все коммуникации; **здание компрессорной станции** – 1-эт., кирп., фундамент бет., перекрытия ж/б, все коммуникации; **здание цеха голтовки** – 1-эт., кирп., фундамент бет., перекрытия ж/б; **здание цеха порошковой металлургии** – 1-эт., кирп., фундамент бет., перекрытия ж/б; **здание гаражей** – 1-эт., кирп., фундамент бет., перекрытия ж/б; **здание электромеханического отделения** – 1-эт., кирп, фундамент бутов, перекрытия дерев.; **здание пристройки к участку ТНП** – 1-эт., кирп., фундамент бет., перекрытия дерев., все коммуникации; **здание КПП** – 1-эт., кирп., фундамент бут., перекрытия ж/б; здание трансформаторной подстанции – 1-эт., кирп., фундамент бут., перекрытия ж/б. | | |
| Условия продажи | аукцион без условий | | |
| Срок заключения договора купли-продажи | в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов | | |
| Условия оплаты | по договоренности Победителя торгов с Собственником имущества при заключении договора купли-продажи | | |
| **Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка** | | **по 25 сентября 2009 г. с 8.30 до 17.30 в адрес Организатора торгов** | |

**Для участия в аукционе в адрес Организатора торгов необходимо предоставить:** заявление на участие; заверенную банком копию платежного поручения о внесении размера задатка, паспорт; **для резидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – доверенность представителю юр. лица (в случае необходимости таковой), копии и оригиналы учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации; **представителям физ. лиц** – нотариально заверенную доверенность; **для нерезидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена не ранее чем за 6 мес. до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; **юр. лицам и физ. лицам** – документ о состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в устан. порядке переводом на бел. (рус.) язык; **представителям юр. и физ. лиц** – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее наиболее высокую цену.** Задаток, внесенный Победителем, будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного имущества, остальным участникам будет возмещен в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. **Организатор торгов или Продавец вправе снять объект с торгов до объявления его проданным.**

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляет Победитель (Претендент на покупку) не позднее 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона на основании счет-фактуры, выдаваемой Организатором торгов до проведения аукциона.

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**

Сустрэча

# Рэлігійныя арганізацыі — дзеля вечных каштоўнасцяў

**Прадстаўнікі ўсіх канфесій 26 краін свету з'едуцца з 31 жніўня па 2 верасня ў Мінск на спецыяльны форум, ініцыятарам якога выступае Фонд ААН у галіне народанасельніцтва (ЮНФПА). Плануецца, што з вітальным словам на першай сустрэчы падобнага кшталту выступіць Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, які адначасова з'яўляецца старшынёй Савета міжканфесійнай місіі «Хрысціянскае сацыяльнае служэнне».**

Лідары хрысціянскіх, мусульманскіх і іудзейскіх рэлігійных арганізацый сустрэнуцца на наступным тыдні ў межах Форуму рэлігійных арганізацый Еўропы і Сярэдняй Азіі. Гэта будзе першая сумесная работа рэлігійных арганізацый з ЮНФПА на рэгіянальным узроўні ў Еўропе і Сярэдняй Азіі.

У полі зроку будуць тры цесна звязаныя тэмы: здароўе, моладзь і сям'я. Паводле слоў каардынатара праграм Фонду ААН у галіне народанасельніцтва Таццяны ГАПЛІЧНІК, падзея мае на мэце абагульніць досвед, вызначыць некалькі канкрэтных крокаў, якія можна зрабіць разам. Адначасова рэлігійныя арганізацыі далучацца да больш шырокага кола партнёраў — урадавых, грамадскіх структур — у вырашэнні глабальных пытанняў народанасельніцтва і развіцця.

Наогул у любой рэлігійнай арганізацыі назапашаны неверагодна вялікі досвед сацыяльнага служэння людзям, работы, якая вядзецца менавіта дзеля здароўя, моладзі і сям'і. З аднаго боку, гэта можа быць канкрэтны выпадак забеспячэння ахвяры хатняга гвалту дахам над галавой у якім-небудзь манастыры або проста маральная падтрымка чалавека, які пайшоў са сваімі праблемамі да духоўніка. З іншага боку, гэта могуць быць і глабальныя крокі. Як, скажам, стварэнне ў 2007 годзе экспертна-кансультацыйнага царкоўнага савета па праблеме ВІЧ і СНІД, які складаецца з прадстаўнікоў Беларускай Праваслаўнай Царквы, Рымска-Каталіцкай Царквы, Саюза евангельскіх хрысціян баптыстаў Рэспублікі Беларусь, Саюза евангеліска-лютаранскіх абшчын Беларусі. Або канкрэтная работа на ўзроўні тых жа 3,5 тысяч хрысціянскіх абшчын па прафілактыцы гвалту ў сям'і, распаўсюджвання наркаманіі, ВІЧ-інфекцыі, туберкулёзу, — як у месцах пазбаўлення волі, так і ў спецыяльных кансультацыйных пунктах, якія плануецца адкрыць у найбліжэйшы час у нашай краіне.

Будучы форум аб'яднае прадстаўнікоў розных рэлігійных арганізацый вакол адной з самых важных для іх тэм агульначалавечых каштоўнасцяў, да ліку якіх натуральна адносяцца моладзь, сям'я і здароўе.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

### ДНЕПР ВЫРАШЫЎ ПАДАРЫЦЬ БЕЛАРУСІ 660 ГЕКТАРАЎ РАЗАМ... З УКРАІНСКІМІ СЁЛАМІ?

Кіраўніцтва Украіны выдзеліла 11,1 млн грыўняў (каля $1,5 млн) для таго, каб рака Днепр не адрэзала на карысць Беларусі 660 гектараў зямлі з вёскамі, — пра гэта паведаміла інфармацыйнае агенцтва REGNUM. Грошы выдзелены на неадкладныя працы па абароне зямель Любецкага пасялковага Савета Рэпкінскага раёна на Чарнігаўшчыне. ПМК-59 прадпрыемства «Чарнігаўвадбуд» яшчэ з 14 жніўня пачало закрываць разрыў паміж возерам Сімпаля і рэчышчам Дняпра. Усяго працы трэба будзе правесці на амаль паўкіламетровым адрэзку берагавой лініі.

Відаць, украінцы баяцца, што разам са змяненнем рэчышча Дняпра зменіцца і дзяржаўная мяжа паміж Украінай і Беларуссю, прычым на карысць нашай краіны. Аднак у прэс-цэнтры Дзяржпамежкамітэта Беларусі патлумачылі, што мяжа прывязаная да геаграфічных каардынатаў: кожны памежны знак і слуп маюць свае каардынаты, і мяжа праходзіць ад знака да знака па гэтых каардынатах, а не па рацэ ці, скажам, па ўзлеску.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

Напярэдадні

# У ДЗЕНЬ ГОРАДА Ў МІНСКУ
## адкрыюцца абноўлены драмтэатр, веладарожка і гарналыжны комплекс
### Чым яшчэ парадуе сталіца ў 922-і дзень нараджэння?

**З нядаўняга часу асабістае свята Мінска прыпадае не на 3 ліпеня, а на другія выхадныя верасня — адпаведнае рашэнне гарадскі савет дэпутатаў прыняў некалькі гадоў таму. Сёлета гуляць жыхары і госці горада будуць 12 і 13 верасня. І хоць дата адзначаецца не круглая, але, запэўніваюць у Мінгарвыканкаме, свята будзе маштабным, паўсюдным і максімальна цікавым для ўсіх катэгорый жыхароў.**

Некаторыя мерапрыемствы да Дня горада адбываюцца ўжо цяпер — напрыклад, ідуць адборачныя туры конкурсу «Міс Мінска». Упершыню сёлета на другі план адышлі мадэльныя стандарты і жорстка абмежаваны ўзрост — куды больш важна, каб удзельніцы мелі за душой розум, талент і жаданне зрабіць штосьці важнае на карысць роднага горада. Тактыка гэтага пошуку дала свой плён — частка дзяўчат, незалежна ад вынікаў конкурсу, будзе задзейнічаная ў разнастайных культурных праграмах і канцэртах, якія ладзіць Мінгарвыканкам. Фінальная ж частка шоу адбудзецца 10 верасня ў культурна-спартыўным комплексе «Мінск-Арэна», трапіць куды можна будзе выключна па запрашальніках.

«Апрача масавых культурных і спартыўных акцый, сярод асноўных святочных мерапрыемстваў і адкрыццё шэрагу аб'ектаў сацыяльнага і культурнага прызначэння — свайго роду падарункі жыхарам горада», — паведаміў кіраўнік гарадскога ўпраўлення культуры Уладзімір Карачэўскі. Так, у Дзень горада адкрыюцца дзве новыя сярэднія школы, бібліятэка, паліклініка, абноўленыя пасля рэканструкцыі драматычны тэатр і дзіцячая бальніца № 3, канькабежны стадыён «Мінск-Арэны», а таксама даўно абяцаная гарадскімі ўладамі веладарожка даўжынёй 27 км (яна пройдзе праз тры раёны — Цэнтральны, Партызанскі і Ленінскі). Акрамя таго, 12 верасня адбудзецца ўрачыстае адкрыццё гарналыжнага комплексу ў Курасоўшчыне, які, плануецца, будзе працаваць круглы год.

**СВЯТА ПА ІНТАРЭСАХ**

Што да самога свята, яно сёлета крыху зменіць фармат — музычныя, спартыўныя і забаўляльныя пляцоўкі будуць падзяляцца па інтарэсах. Напрыклад, маленькіх мінчан і іх бацькоў чакаюць свята «Няхай заўжды будзе дзяцінства» — на праспекце Пераможцаў (ля амфітэатра за фантанам), забаўляльная праграма — у Цэнтральным парку імя Горкага, і свята творчасці з удзелам выхаванцаў музычных і мастацкіх школ «Квітней, мой Мінск, мая сталіца!» — на зялёнай зоне каля Мемарыяльнага музея-майстэрні Заіра Азгура. Моладзь, схільная да больш актыўнага баўлення часу, знойдзе яго на пляцоўцы ля Палаца культуры і спорту чыгуначнікаў, дзе адбудзецца гарадскі турнір камандаў КВЗ, спаборніцтвы па экстрэмальных відах спорту, а таксама канцэртная праграма моладзевых калектываў. А вось на пляцоўку ля Нацыянальнай бібліятэкі можна прыйсці ўсёй сям'ёй — адным будзе цікавы парад грамадзянскай тэхнікі і выстава-кірмаш прадукцыі сталічных прадпрыемстваў, другія з задавальненнем паслухаюць гала-канцэрт лаўрэатаў і пераможцаў фестывалю народнай творчасці «Сузор'е», што праходзіць у Мінску раз на тры гады, трэція ацэняць святочны канцэрт Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. Госці горада могуць скарыстаць зручны выпадак і трапіць на адмыслова падрыхтаваныя выставы сталічных музеяў — плануецца, што працаваць яны ў гэтыя выхадныя будуць да позняй ночы.

Найшырэйшы выбар, куды падацца, у меламанаў: ля гарадской ратушы па традыцыі ладзіцца свята духавой музыкі, выступленні фальклорных ансамбляў і калектываў народнай творчасці можна будзе пачуць на тэатралізаванай выставе-кірмашы «Горад рамёстваў», што разгорнецца насупраць Палаца спорту, а прыхільнікам класікі 13 верасня Оперны тэатр зробіць свой падарунак — дабрачынны канцэрт пад адкрытым небам.

Святочныя мерапрыемствы адбудуцца ва ўсіх дзевяці раёнах горада. А завершыцца Дзень горада 20-хвілінным феерверкам ля стэлы «Мінск — горад-герой».

**А «ДЫНАМА» БЯЖЫЦЬ? УСЕ БЯГУЦЬ!**

«Такога калейдаскопа мерапрыемстваў міжнароднага ўзроўню ў Дзень горада мінчане яшчэ не бачылі», — інтрыгуе начальнік упраўлення фізкультуры, спорту і турызму Міхаіл Юспа. Мяркуючы па спісу названых спаборніцтваў, у гараджан і гасцей сталіцы сапраўды найперш паўстане праблема — як паўсюль паспець?

5 верасня на тэрыторыі аэрапорта «Мінск-1» пройдзе этап Адкрытага чэмпіянату Беларусі па драгрэйсінгу — хуткасным ваджэнні аўтамабіляў. Удзел у гэтых спаборніцтвах бяруць мацнейшыя гоншчыкі з Беларусі, Расіі, Украіны і Прыбалтыкі, а гледачам абяцаюць не толькі рэкорды хуткасці і экзатычнае шоу, але і дэманстрацыю гістарычнай тэхнікі.

9 верасня прыйдзе чарга пахваляваца футбольным балельшчыкам: у Мінску пройдзе адборачны матч чэмпіянату Еўропы паміж зборнымі Беларусі і Украіны.

З 9 па 11 верасня ў беларускай сталіцы пройдзе Адкрыты Кубак Беларусі па спартыўнай гімнастыцы, а разам з ім — міжнародныя спаборніцтвы на прызы 6-разовага алімпійскага чэмпіёна Віталя Шчэрбы.

12 верасня ў мінскім Палацы спорту байцы з 6 кантынентаў паспрачаюцца за званне чэмпіёна ў Міжнародным турніры па тайландскім боксе «Grand Prix «Каралі Муай Тай».

Нарэшце, 12 верасня беларусы змогуць не толькі паглядзець на іншых, але і паўдзельнічаць самі ў спартыўных спаборніцтвах. Да прыкладу, у Міжнародным мінскім марафоне. У забегах на 1 км, 4,2 км, 10 км і класічнай марафонскай дыстанцыі 42195 м. Паводле папярэдняй інфармацыі, ужо заяўленыя каля 250 спартсменаў, а ўвогуле чакаюцца ўдзельнікі з 15 краін свету.

А вось заяўленага было на стадыёне «Дынама» эстрадна-спартыўнага шоу — футбольнага матчу і канцэрта з удзелам камандаў зорак расійскай і беларускай эстрады — мінчане, на жаль, не пабачаць, гэта мерапрыемства адмяняецца. Больш падрабязную праграму Дня горада Мінгарвыканкам абяцае даць у найбліжэйшыя дні.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**


# УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

Минский городской центр недвижимости

2 октября 2009 г. проводит открытый аукцион с условиями № 04-У-09 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

**Вид аукциона:** открытый (на повышение цены продажи).

**Предмет аукциона:** право проектирования и строительства капитального строения (здания и сооружения) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты недвижимости, подлежащие сносу.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Минске по 2 земельным участкам, предоставляемых в аренду сроком на 5 лет:

| Лот №: | Место расположения земельного участка | Площадь земельного участка, га | Функциональное назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб. | Наличие обременений | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Радиальная – ул. Омельянюка – ул. Челюскинцев | 6,46 | Многофункциональный торгово-развлекательный комплекс с гостиницей, кафе, административными помещениями, многоуровневыми автостоянками согласно проекту застройки № 34, 35, 36, 37 по генплану | 4 435 109 680 | 399 159 870 | 74 125 843 | Снос зданий и сооружений, подпадающих под пятно застройки | 28 476 308 000 |
| 2 | ул. Короля – ул. Проектируемая (согласно ПДП квартал 2) | 1,64 | Многофункциональный комплекс общественного назначения (административный, торгово-развлекательный и др.), квартал 2 | 1 613 095 800 | 145 178 620 | 11 872 364 | Снос административных зданий, здания складского корпуса и помещения гражданской обороны по ул. Короля, 71, 73, здания РП по ул. Короля, 73а, жилых домов усадебной застройки №№ 4, 6, 19, 21, 23 по ул. Короля (ранее – пер. Обувной) | 2 976 377 000 |

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **2 октября 2009 года в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Для участия в аукционе необходимо:

**внести задаток** в указанном выше (в таблице) размере, который составляет 9 % от начальной цены заявленного лота (лота с наибольшей стоимостью – в случае участия в торгах по нескольким лотам), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – Финансовое управление Мингорисполкома (задатки по лотам вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

**представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» – организатору аукциона следующие документы:**

заявление на участие в аукционе;

заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в установленном размере (без НДС);

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, которому по результатам аукциона в установленном порядке предоставляется земельный участок, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения.

Дополнительно представляется:

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов** для участия в аукционе начинается с **10.00 31 августа 2009 года** и заканчивается в **17.00 28 сентября 2009 года.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому выставленному лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются как единственным, подавшим заявление на участие в аукционе) в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков обязаны:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона;

- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком заключает с победителем аукциона (в установленных законодательством случаях – с его участником) договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) и договор аренды сроком на 5 лет.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский горисполком может предоставить победителю аукциона рассрочку по внесению платы за предмет аукциона в установленном порядке.

После истечения срока аренды земельного участка (5 лет), предоставленного по результатам аукциона, лицо, которому он предоставлен, в установленном порядке обращается в адрес Минского горисполкома с заявлением о продлении срока аренды соответствующего участка (заключении нового договора аренды), на основании которого по решению исполкома ему предоставляется земельный участок на указанный в заявлении срок, но не более чем на 99 лет, при условии внесения этим лицом платы за право аренды земельного участка, рассчитанной на основании его кадастровой стоимости с применением коэффициентов, установленных Советом Министров Республики Беларусь исходя из сроков аренды земельных участков.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по соответствующим земельным участкам, а также приобретения лотовой документации.

В дни и время, указанные в объявлении, размещаемом на информационном стенде (фойе офиса УП «Минский городской центр недвижимости»: г. Минск, ул. К. Маркса, 39), организатором торгов предоставляется транспорт для обеспечения осмотра земельных участков желающими принять участие в аукционе.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. №№ 4, 6.

Контактные телефоны: + 375 (17) 226 16 72, + 375 (17) 227 40 22.

Дополнительная информация о выставленных на аукцион участках, а также условия участия в торгах и бланки требуемых документов размещены на официальном сайте организатора торгов www.mgcn.by.



# УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

Минский городской центр недвижимости

2 октября 2009 г. проводит открытый аукцион № 04-А-09 на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске

**Вид аукциона:** открытый (на повышение цены продажи).

**Предмет аукциона**: право заключения договора аренды земельного участка.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

На торги выставляется право аренды на 5 лет 2 земельных участков для строительства в г. Минске:

| Лот № | Место расположение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | S, га | Функциональное назначение предполагаемого объекта строительства | Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.) | Сумма задатка, бел. руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб. | Характеристика расположенных на земельном участке коммуникаций и сооружений | Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 1 | ул. Селицкого – ул. Шабаны | 500000000002007036 | 0,3429 | Дом быта (№ 42 по генплану) | 179 430 540 | 16 148 750 | 2 361 967 | Свободен от застройки | – |
| 2 | р-он ул. Кабушкина – ул. Машиностроителей | 500000000002007061 | 0,1223 | Автомоечный комплекс на 1 пост | 29 832 860 | 2 684 960 | 2 357 183 | Участок занят гостевой автостоянкой для клиентов ОАО «Минскжелезобетон» | – |

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **2 октября 2009 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток** в указанном выше (в таблице) размере, который составляет 9 % от начальной цены заявленного лота (лота с наибольшей стоимостью – в случае участия в торгах по нескольким лотам), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – Финансовое управление Мингорисполкома (задатки по лотам вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

**представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» – организатору аукциона следующие документы:**

заявление на участие в аукционе;

заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в установленном размере (без НДС);

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, которому по результатам аукциона в установленном порядке предоставляется земельный участок, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения.

Дополнительно представляется:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов** для участия в аукционе начинается с **10.00 31 августа 2009 года** и заканчивается в **17.00 28 сентября 2009 года.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому выставленному лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются как единственным, подавшим заявление на участие в аукционе) в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков обязаны:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона;

- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком заключает с победителем аукциона (в установленных законодательством случаях – с его участником) договор аренды земельного участка сроком на 5 лет.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский горисполком может предоставить победителю аукциона рассрочку по внесению платы за предмет аукциона в установленном порядке.

После истечения срока аренды земельного участка (5 лет), предоставленного по результатам аукциона, лицо, которому он предоставлен, в установленном порядке обращается в адрес Минского горисполкома с заявлением о продлении срока аренды соответствующего участка (заключении нового договора аренды), на основании которого по решению исполкома ему предоставляется земельный участок на указанный в заявлении срок, но не более чем на 99 лет, при условии внесения этим лицом платы за право аренды земельного участка, рассчитанной на основании его кадастровой стоимости с применением коэффициентов, установленных Советом Министров Республики Беларусь исходя из сроков аренды земельных участков.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по соответствующим земельным участкам, а также приобретения лотовой документации.

В дни и время, указанные в объявлении, размещаемом на информационном стенде (фойе офиса УП «Минский городской центр недвижимости»: г. Минск, ул. К. Маркса, 39), организатором торгов предоставляется транспорт для обеспечения осмотра земельных участков желающими принять участие в аукционе.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. №№ 4, 6.

Контактные телефоны: + 375 (17) 226 16 72, + 375 (17) 227 40 22.

Дополнительная информация о выставленных на аукцион участках, а также условия участия в торгах и бланки требуемых документов размещены на официальном сайте организатора торгов www.mgcn.by.


# ВЯСКОВАЕ КАХАННЕ

***(Заканчэнне. Пачатак на 6-й стар.)***

Толькі зварыла квашаніну, разліла па талерках і вынесла ў камору. І тут у хату ўляцеў, бы звар'яцелы, Уладзік. Крычыць: курва, поскудзь, свалата; заб'ю, зарэжу цябе і твайго огера. Палюбоўніка, значыць. Кулакамі размахвае, скача, пена з рота прэ. Дурань, чыстай вады дурань. Кацярына плюнула яму ў твар і неяк спакойна, без усялякага хвалявання пачала збіраць адзенне ў вялізную сумку, з якой у дзевяностых гадах ездзіла ў Польшчу. Пасля патэлефанавала Мазуру. Ён даўно прапаноўваў пераехаць да яго. У хаце адна старэнькая маці, перашкаджаць ім не будзе. А як дзеці? Не, дзеці не трэба. Сваіх зробяць. А гэтых хай папіхіч гадуе. Доўга не згаджалася на гэта Кацярына, а цяпер пагадзілася. Адно жаданне было: з'ехаць як хутчэй. Абрыдла жыць з некаханым, нецікавым чалавекам, які думае толькі пра камбікорм, свінні, карову. І ў хляве, цішком ад жонкі, выжлукціць бутэльку віна.

На дзень нараджэння яшчэ пабыла ў хаце. Выпіла чарку з гасцямі, паспявала, нават паскакала «Лявоніху». Назаўтра з чыстай душой Кацярына паехала з Мазурам да яго. Новая свякруха мала гаварыла, больш маўчала. Толькі на печы, перад тым як заснуць, кожны дзень штосьці бубніла. Аднойчы Кацярына пачула: малады хлопец, чужую жонку прывёў. Дзевак паўсвета, а ён — другую мамку сабе знайшоў.

Дзяцей Кацярына наведвала часта, але старалася, каб Уладзіка не было. Не тое што яго баялася, проста ніякавата сябе адчувала.

З Мазурам кожная ноч была гарачай, салодкай. Раніцай не хацелася ўставаць з ложка. Так яны пражылі паўгода. Спярша ў вёсцы стаяў гуд. Усе забыліся пра Чачню, Амерыку, Афганістан, перасталі клясці мясцовую ўладу. Адна размова была пра новую маладую сям'ю.

Неяк Кацярына сабралася мыць бялізну. Кідала ў машыну. На кашулі Мазура ўбачыла дзве вялікія плямы ад памады. Чужой памады, бо сама такой не карысталася. Увечары яна сварылася, адмаўлялася падаваць есці Мазуру. Потым сабе здзіўлялася, як так магла. Ён доўга маўчаў, слухаў, толькі ўсё выціраў акуляры. Гэта была дакладная адзнака ягонай узбуджанасці. Аднак Кацярына не магла ніяк супакоіцца і ўсё крычала, абражаючы яго.

Мазур моўчкі, няспешна, пазбіраў па хаце яе рэчы, запхаў у сумку і вынес у двор. Пасля ўзяў Кацярыну за руку. Як была ў халаце і тапках, вывеў за парог і зачыніў за ёй дзверы.

Ноч яна прасядзела, дрыжучы ад холаду, у садзе. Раніцай папрасіла суседа падвезці яе.

Кацярына зайшла ў сваю хату і ледзь не страціла прытомнасць. На ўслоне ля печы сядзелі Уладзік і дзеці. Яна ўпала на калені перад імі і заплакала. Цяклі слёзы, але адразу знікалі: іх выціралі рукі самых дарагіх для яе людзей. Цяпер яна гэта зразумела.

Дні цяклі, як вада ў рэчцы. У клопаце, турботах. Ужо быццам і забыліся ў вёсцы пра іхні раман з Мазурам, але ж так проста тыя паўгода з сэрца не выкінеш. Не раз прачыналася Кацярына ад таго, што плакала ў сне, сварылася з Мазурам і нават білася. Хоць да гэтага не дайшло. Бывала, пачуўшы цяжкае дыханне грузавіка, выходзіла ў двор і глядзела: а раптам ён?

Да Уладзіка, здавалася, вярнуліся светлыя і прыгожыя дні пасля вяселля. Такі стаў абыходлівы, ласкавы. Зубы пачаў чысціць. Як паголіцца, адэкалонам твар папырскае. Ездзіў у райцэнтр і адтуль вялізны букет прывёз. Здурнеў мужык, у двары сваіх мора. Нічога не сказала, падзякавала. Нават пацалавала. Дык ён да дванаццаці ночы калоў дровы. Суседка Казліха Маня заходзіла, пытаецца: «Што гэта ён у цябе ўсё стукае? Спаць не дае».

...У іхняй змены на мясакамбінаце быў чарговы медыцынскі агляд. Яе паглядзелі, і па тым, як пераглянуліся ўрач з медсястрой, Кацярына зразумела, што гэта невыпадкова. Яна і сама ўжо з месяц адчувала сябе кепска. Яе пастаянна хістала, нібыта п'яную, балеў правы бок. Да ўрача не звярталася. Наогул лічыла сябе вельмі здаровай. Бабуля пражыла дзевяноста пяць гадоў. У дзевяноста скакала на вяселлі ўнучкі. Чым Кацярына горшая? Як кажуць, па пародзе куры чубатыя.

Дыягназ быў страшны: рак апошняй стадыі. Свае астатнія дні яна ляжала і толькі плакала, маліла Уладзіка яе забіць альбо атруціць. Так ёй балела.

За некалькі гадзін да смерці Кацярына папрасіла, каб Уладзік паклікаў Мазура. Той падышоў да ложка, бледны, з дрыжачым падбародкам. На яе не глядзеў, маўчаў. Нарэшце вымавіў:

— Прабач...

— Дзякуй...— прашаптала Кацярына, але ўсе, хто стаяў недалёка, гэта таксама пачулі...

# ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА*

**«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-6**

Аб'яўляем шосты конкурс на прызы калектыву Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі (кіраўнік Канстанцін Міхайлавіч БАРЭЛЬ) — з нормай першага спартыўнага разраду па шашках.

Будуць адзначаны пераможцы конкурсу, яго суддзя і каардынатар, а таксама лепшая рашальніца. А каб стаць першакласным рашальнікам, трэба быць пільным і не прапусціць выпадкі, калі будуць у пазіцыях пабочныя разгалінаванні альбо якія не развязваюцца.

Таму за ўказанне такіх істотных недахопаў налічваюцца прэміяльныя балы. Норма ж другога разраду — рашыць усе 12 заданняў, кожнае з якіх ацэньваецца ў адно ачко.

А цяпер падаём першае заданне:



Белыя: a1, b4, d6, f4, f6, g5 (6). Чорныя: a5, d2, e3, f2, h4, h8 (6). Выйгрыш.

Тэрмін для адказаў — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».

БЛІЦ-49/6

Прапануем паказаць сваё майстэрства ў ім аматарам 100-клетак пры рашэнні задачы нашага аўтара з Украіны Уладзіміра Рычкі:



Белыя: 17, 21, 27, 39, дамкі 1, 2, 36 (7). Чорныя: 16, 26, 45 (3). Замкнуць простую чорных.

**ФАНТАСТЫЧНЫ ВЫНІК**

Такую ацэнку на сайце еўрапейскай канфедэрацыі шашак атрымала выступленне нашых суайчыннікаў на 11-м чэмпіянаце кантынента па шашках-100 сярод моладзі. Ён адбыўся ў нідэрландскім горадзе Хайкене, дзе юніёры Андрэй Толчыкаў (Гомель), Дар'я Федаровіч (Мінск), міні-кадэтка Вера Хвашчынская (Бабруйск) і намінантка катэгорыі «еўрапейскія надзеі» мінчанка Марыя Міронава заваявалі залатыя медалі.

Бронзавая ўзнагарода ўручана Вользе Федаровіч. Дар'я і Вольга — сёстры-блізняты.

Моладзь рыхтавалі да адказных спаборніцтваў такія вопытныя трэнеры, як міжнародны гросмайстар Сяргей Насевіч, майстры Кірыл Хайнюк, Мікалай Кадзеснікаў і Віталь Аніська.

**РАШЭННІ**

Аўтарскі-8/13 (П. Шклудаў): c5 (de7 A) d2 (g7) a5 (cd6) d8, e5, a5 (g5) c7x. A (hg5) h6 (e5) d6 (f4) g5, e3 (de7) (С. Балжаларскі) c1 (d4 B) b2 (e3) f6, d2x. B (d6) e3 (d4) e7,g7 (Блонд)x.

Бліц-49/3 (Г. Андрэеў): 38, 1, 1-6, 20, 1, 5x.

Па-за конкурсам: П. Шклудаў — падманлівы след 1. dc7? (d6) b8 (e7) c3 (cd4) b2 (e3) a7 (b4!) a5 (d2) c5, e1 (f4) g7 (g3) d4 (f6) g7 (h2)=; Г. Андрэеў — 44, 43, 34, 3, 16x.

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Хочаце — верце...

# НА КРЫЗІС ЛЕПШ НЕ ЗВЯРТАЦЬ УВАГІ, або Чаму лічба «10» цяпер «знакавая»?

— І хто вам сказаў, што так званы сусветны фінансавы крызіс пачаўся толькі ў мінулым годзе? — У сваю чаргу запытаў мяне віцебскі спецыяліст па лічбах Сяргей Клябанаў, да якога я звярнуўся па каментарый наконт крызісу. Ён, бадай, найлепш за астатніх у горадзе над Заходняй Дзвіной ведае, што такое нумаралогія. І паспяхова карыстаецца ёй ужо даўно, нават у свой час вёў адпаведныя курсы.

— Памылка гэта, — працягвае Сяргей Клябанаў, — значна раней крызіс «нарадзіўся» — гадоў пад дзесяць таму, калі лічыць ад мінулага года. Нездарма ўжо даўно астролагі прадказвалі ў сувязі са зменай тысячагоддзя — «канец свету». Не памыліліся, свет і змяніўся.

На думку «майстра лічбаў», не трэба звяртаць увагі на крызіс, а лічбы... Рэкамендуецца «закрываць» «шкодныя» лічбы.



— Растлумачу коратка, — працягвае мой суразмоўца. — Калі ўжо самая «рэальная дата» «нараджэння» крызісу — мінулы год, лепш пазбягаць камбінацыі лічбаў «2008». Напрыклад, у нумары свайго мабільнага тэлефона трэба пазбягаць гэтых «шкодных» лічбаў, заўсёды вельмі проста і нядорага можна змяніць нумар. Таксама трэба старацца не прызначаць важныя сустрэчы на 20-я лічбы кожнага месяца і пажадана пасля 20.00 не рабіць ніякіх важных спраў.

А вы заўважылі, якім быў 20-ы дзень жніўня (восьмы месяц. — **А.П.**)? Мітуслівы дзень. Я асабіста заўважыў. Наш правінцыйны гарадок нейкім чынам нагадваў у той дзень мне вялікі і не самы прыстасаваны для добрага жыцця мегаполіс. Мітусня, хаос на дарогах. Заўважце: 20-га, 08-га месяца...

Наконт канца крызісу спецыяліст па лічбах прагназуе, што ён канчаткова скончыцца не раней, чым у 2017-м. А больш рэальны час — 2018 год.

— Дарэчы, у Расіі, ды і ва ўсіх краінах былога СССР менавіта 2018 год будзе асаблівым. Трохі больш за 100 гадоў пройдзе з года Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, а па календарах розных народаў новы год пачынаецца ў розны час. Так што 100 гадоў для нас — на ўсходзе яшчэ не 100, — працягвае знаўца лічбаў. — Магчыма, збудзецца і яшчэ фантастычны прагноз па захаванні цела Леніна. Прычым тут крызіс? Усё ў свеце мае сувязь. Ленін — знакавая фігура не толькі для былой Расійскай імперыі. Я асабіста не думаю, што трэба мусіраваць пытанне яго перазахавання. Але ж, заўважце, па тэлебачанні (расійскія каналы. — **А.П.**) перыядычна пра гэта гавораць.

У 2018-м цяперашняму крызісу споўніцца 10 гадоў. Вельмі знакавы 10-гадовы «юбілей» у даследчым накірунку пад назвай нумаралогія. 100 гадоў падзяліць на дзесяць... ды і атрымаецца 10.

А пра ранейшы крызіс, фінансавы 1998 года (так званы дэфолт) ужо забылі? Заўважце, толькі менавіта дзесяць гадоў прайшло да пачатку чарговага крызісу і не апошняга, ужо мне вы паверце...

Ці можна прагназаваць, што цяперашні сусветны фінансавы крызіс скончыцца хутка, або, як канстатаваў мой першы суразмоўца, крызіс скончыцца толькі бліжэй да 2018 года? — запытаў я **псіхолага Канстанціна БОНДАРАВА**.

— Нумаралогія — гэта не сфера маіх заняткаў, але адназначна можна сказаць, што крызіс не можа прайсці за год, другі. Я маю на ўвазе не сусветную эканоміку, а псіхіку чалавека, — расказвае псіхолаг. — Напэўна, і неспецыялісты ведаюць, што, напрыклад, развод для чалавека — гэта вялікі шок. І не можа ён за год, два «пераварыць» гэтую канкрэтную трагедыю ў асабістым жыцці. Крызіс сусветны — рэч не асабістая толькі на першы погляд. Безумоўна, павышэнне цэнаў, праблемы ў сямейным бюджэце, якія «раптам» адчуваюцца, не могуць не адбівацца на людзях.

Крызіс сусветны — ён жа і індывідуальны. Іншая справа — як індывідууму асобна «вылезці» з яго? Мабыць, толькі на востраве адзіночка можа яго не адчуваць?

Мая парада — на крызіс лепш не звяртаць увагі! Ну, не вайна ж!

Дрэнныя думкі прыцягваюць праблемы. Маўляў, вось крызіс, ён уплывае... А што, калі не было б крызісу, праблем не было? А цяпер чамусьці стала модным ва ўсім вінаваціць той самы крызіс. Для арганізма любы крызіс стану здароўя — сігнал пра тое, што трэба мяняць лад жыцця: адмовіцца ад шкодных звычак, больш пільна сачыць за сабой. Ды своечасова звярнуцца да доктара. Доктарам, на мой погляд, у крызісны час кожны павінен стаць для сабе сам. Падумаць, паразважаць. Зразумела, калі ўжо ўсё так дрэнна, трэба прыйсці па дапамогу да псіхолагаў. Хай не дадуць рэкамендацыю, як «выжыць» падчас крызісу, а супакояць.

Курыце? Пачак штодня? Калі лічыць, што ў сярэднім пачак цыгарэт каштуе ў эквіваленце долар, колькі можна зэканоміць за месяц? А «кадзіраванне» каштуе дорага? Дык падлічыце — лепш раз заплаціць «дорага», дык потым эканоміць. Кажуць, кадзіраванне шкоднае для псіхікі. Сучасныя метады, на мой погляд, наогул не ўплываюць на псіхіку. Дарэчы, псіхалагічны стан чалавека залежыць ад яго фізічнага стану і наадварот. Дык хто здаравейшы — курыльшчык або не? Як і аматар выпіць і наадварот.

Крызіс можа пайсці на карысць разумным людзям. І ранейшыя заклікі наконт здаровага ладу жыцця, і іншыя могуць цяпер стаць як ніколі актуальнымі.

Яшчэ наконт рэальных прапаноў па пераадольванні крызісу ад маіх суразмоўцаў.

**Больш эканомна траціць сямейны (індывідуальны) бюджэт.** Трэба падзяліць яго на дні. Адпаведна пры траце вялікай сумы трэба абавязкова доўга падумаць — колькі штодзённых бюджэтаў вы патраціце і ці трэба гэта рабіць у канкрэтнай сітуацыі? Мо лепш і не пайсці лішні раз у госці, калі вас запрашаюць? Штодня адкладвайце нейкую суму (у «антыкрызісны кашалёк»).

**Наконт зніжак у крамах.** Няўжо вы паверыце, што, напрыклад, зніжкі ў 70 працэнтаў (а і такое бывае) гэта прывабна? Думаецца, раней гандляры проста ў разы завышалі цэны. Банкі айчынныя стабільна выплачваюць працэнты, калі вы захоўвайце на рахунках свае грошы, і інфляцыя вам не пагражае. Безумоўна, не трэба нават каб тая ж нумаралогія падказала, гэтым нельга не скарыстацца.

Прасцей за ўсё абвінавачваць у крызісе начальства. Маўляў, грошай плацяць, як і раней, а цэны падняліся ў разы. Заўсёды пры вялікім жаданні можна знайсці «халтуру». Праўда, ці спадабаецца гэта вашым кіраўнікам? Упэўніце іх, што асноўнай працы прыработак не перашкаджае.

Па досведу маіх знаёмых заўважыў, што нават дробязі дазваляюць эканоміць. Напрыклад, чаму б не змяніць прычоску — хадзіць у цырульню не так часта, як раней? Не праехаць некалькі прыпынкаў, а прайсціся? Падлічыце: у Віцебску праезд на маршрутцы каштуе 1000 рублёў. Ці не больш выгадна і карысна прайсціся пешшу, калі выйсці з дому раней? Калі няма дачы і вы купляеце агародніну на базары, то чаму б не стаць пастаянным пакупніком у канкрэтнага прадаўца? І лепш браць, напрыклад, агуркі ў яго оптам, ды са зніжкамі і за разавыя пакупкі.

***Спосабаў зэканоміць шмат. Падзяліцеся на старонках «Звязды» і ўласным досведам! І ці ўплываюць на ваша жыццё лічбы?***

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.13 | 20.07 | 13.54 |
| Віцебск — | 5.59 | 19.59 | 14.00 |
| Магілёў — | 6.03 | 19.57 | 13.54 |
| Гомель — | 6.02 | 19.51 | 13.49 |
| Брэст — | 6.28 | 20.22 | 13.54 |
| Гродна — | 6.32 | 20.20 | 13.48 |

**Месяц**

***Першая квадра 27 жніўня. Месяц у сузор'і Казярога.***

**Імяніны**

***Пр.*** *ТРЭЦІ СПАС, Аляксандра, Дзяміда.*

***К.*** *Сабіны, Віталя, Яна.*



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.




...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +19..+21°C | КІЕЎ +20..+21°C | РЫГА +16..+18°C |
| ВІЛЬНЮС +15..+17°C | МАСКВА +19..+21°C | С.-ПЕЦЯРБУРГ +10..+12°C |

Дзве даты

## 29 жніўня

**1846 год** — акцёрам Вяржбіцкім у Мінску створана артыстычная трупа, якая па сутнасці стала першаасновай пастаяннага Мінскага гарадскога тэатра. На яе патрэбы гарадское кіраванне пачало штогод адпускаць па 2 тысячы рублёў. Была сфарміравана адмысловая камісія, якая зацвярджалася губернатарам, яна ажыццяўляла пастаянны кантроль за тэатральнай дзейнасцю ў Мінску. Тэатр стаў неаддзельнай часткай гарадской культуры. З'явілася маса антрэпрэнёраў і перасоўных труп, якія выступалі на розных сцэнах і ў залах горада. Будынак гарадскога тэатра знаходзіўся на Саборнай плошчы. У 1847—51 гадах паказы праходзілі ў ратушным тэатры, у 1864—77-м — у зале Дваранскага сходу. А ў 1884 годзе гарадскі тэатр і зусім згарэў. Ініцыятарам пабудовы новага будынка тэатра выступіў губернатар, князь Трубяцкі, які як чалавек адукаваны выдатна разумеў значэнне гэтага віду мастацтва. Па яго меркаванні, тэатр «можа служыць такой жа школай, такой жа прыладай маральнага выхавання, як і навучальныя ўстановы». Месца для будынка было абрана ў Аляксандраўскім скверы. Адкрыўся новы тэатр 5 чэрвеня 1890 года аматарскім спектаклем «Сфінкс» А. Фельбе.



**1949 год** — Савецкі Саюз на палігоне ў Сяміпалацінску пад кіраўніцтвам акадэміка І. Курчатава правёў выпрабаванне сваёй першай атамнай бомбы.

Цытата дня:

***«Лепш у аднаго разумнага быць у пашане, чым у тысячы дурняў».***

**Рыгор Скаварада (1722—1794), украінскі філосаф, пісьменнік.**

## Усміхнёмся!

**Я сёння такая незапатрабаваная, што прыходзіцца быць ганарлівай.**

☺

— У цябе выпіць ёсць?
— Вядома! Зараз прынясу вады.
— Я ў цябе выпіць прасіў, а не памыцца.

☺

**Карэспандэнт:**
**— Дзядуля, а колькі табе гадоў?**
**— Сто пяцьдзесят восем.**
**— Ачмурэць! Але ж ты і п'еш і курыш?!**
**— Вядома! Інакш я ніколі не памру...**

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Крыжаванка (22 жніўня). Па гарызанталі:** 1. Шабас. 7. Шарош. 11. Мустанг. 13. Гэбель. 14. Кантар. 15. Нэсэсэр. 16. Эстамп. 18. Скакун. 19. Бусак. 21. Рыска. 24. Карат. 27. Бандура. 29. Локшына. 30. Адрэналін. 31. Манія. 32. Сувой. 33. Калясніца. 35. Кінавар. 36. Еўдакія. 37. Мышца. 41. Салея. 42. Адвал. 46. Турман. 48. Рыцына. 49. Калізія. 50. Папуры. 51. Ліштва. 52. Відэлец. 53. Бастр. 54. Банка. **Па вертыкалі:** 2. Арбіта. 3. Апломб. 4. Куфэрак. 5. Стрэс. 6. Энтэрыт. 8. Агатка. 9. Оптыка. 10. Эгрэт. 12. Грэна. 17. Пудра. 18. Склон. 20. Карэляцыя. 21. Радаўніца. 22. Карацін. 23. Адцінак. 25. Ушчунак. 26. Антонім. 28. Адвар. 29. Лісце. 33. Калан. 34. Аўчар. 37. Межавік. 38. Адзінец. 39. Ступа. 40. Кропка. 41. Сакрэт. 43. Лысіна. 44. Рышток. 45. Чакан. 47. Лідар.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

## Дзевам не варта ўпарціцца, а Скарпіёнам лепш не звязвацца з экстравагантнымі ідэямі і прапановамі

**АВЕН.** Ад аб'ёму выкананай працы будзе залежаць атрыманая вамі ўзнагарода. Але не забывайце пра адпачынак і не працуйце ў шкоду здароўю. Не трэба вінаваціць сябе, калі разладзіліся адносіны з некаторымі калегамі: магчыма, хтосьці зайздросціць вашым поспехам. Надыходзіць удалы час для тых, каму неабходна ўладкавацца на працу. Пачынайце асвойваць замежныя мовы — гэта можа стаць дапамогай у прасоўванні па кар'ернай лесвіцы.

**ЦЯЛЕЦ.** Спадарыня Фартуна вырашыла ўсміхнуцца вам: гэты тыдзень, хутчэй за ўсё, будзе менш напружаным, чым адыходны. З'явіцца і вольны час, і магчымасць трохі адпачыць і развеяцца. А інтуітыўна-містычнае ўспрыманне рэальнасці дапаможа ў гэтыя дні стварыць выдатную базу для будучых поспехаў. Паспрабуйце толькі планамерна павышаць уласную самаацэнку.

**БЛІЗНЯТЫ.** Вы можаце сутыкнуцца з тэрміновымі справамі. З'явіцца дадатковая нагрузка, а засяродзіцца стане цяжэй. Не саромейцеся папрасіць дапамогі. Найлепшым выйсцем было б наогул дэлегаваць усю адказнасць каму-небудзь дзейнаму, каб у вас атрымалася прысвяціць гэты тыдзень адпачынку. Калі гэта ўсяго толькі мара, паспрабуйце хоць бы больш спаць. Хатнія і сямейныя справы могуць выйсці на першы план.

**РАК.** Новыя сустрэчы і знаёмствы будуць асабліва важныя, так што праявіце актыўнасць. Колькі часу вы марнуеце на мары аб нязбытным? Пакуль ёсць сілы і час, лепш выдаткуйце іх на больш практычную дзейнасць. Не захапляйцеся марнаваннем грошай: вы створыце аб сабе лепшае меркаванне, праявіўшы разважлівасць, а не паказную шчодрасць з мэтай зрабіць уражанне.

**ЛЕЎ.** У панядзелак спаборніцтва з раптоўнымі канкурэнтамі можа паглынуць усе вашы думкі. Паспрабуйце своечасова спыніцца — тады з'явяцца ўсе шанцы на поспех. У аўторак не рэкамендуецца займацца справамі, якія патрабуюць вялікай адказнасці. У сераду не шкадуйце сілаў і часу, каб добра падрыхтавацца да будучай вечарынкі. Вас могуць запрасіць у нейкае элітарнае грамадства.

**ДЗЕВА.** Неабходна праявіць цярпенне і стрыманасць у эмоцыях — тады не з'явіцца сітуацый, якія перашкаджаюць раскрыццю творчага патэнцыялу. Паспрабуйце не праяўляць празмернай упартасці — у спрэчках і дыскусіях неабходна не толькі прытрымлівацца свайго пункту гледжання, але і чуць аргументы супернікаў. Можа быць, надышоў час змяніць светаадчуванне і бязлітасна выкінуць састарэлыя погляды з вашага жыцця.

**ШАЛІ.** Паспрабуйце прывесці думкі і пачуцці ў парадак. І перастаньце кіснуць — зазірніце ў сябе, ураўнаважце свой эмацыйны стан. Наступіў спрыяльны час для наладжвання згубленых сувязяў — яны вам спатрэбяцца ў найбліжэйшай будучыні. Не забывайцеся пра родных і блізкіх.

**СКАРПІЁН.** Будзьце больш асцярожнымі з экстравагантнымі ідэямі і прапановамі. У панядзелак або сераду не выключаныя прыкрыя перашкоды ў справах і планах. У пачатку тыдня пераменнасць падзей, якія не залежаць ад вашай волі, можа прынесці змены ў дзелавыя і партнёрскія адносіны, грашовыя справы, а таксама справакаваць складанасці ў кар'еры і адносінах з начальствам. Чацвер — адзін з самых удалых дзён тыдня: у гэты дзень шматлікае паспеее вырашыць, і перад вамі могуць адкрыцца новыя магчымасці. У суботу паспрабуйце не паддавацца на спакуслівыя прапановы, лепш спакусіце каго-небудзь.

**СТРАЛЕЦ.** З'явіцца шанц заваяваць чарговую завоблачную вяршыню, недаступную для таго, хто схільны цвяроза ацэньваць свае магчымасці. Спіс вашых прамых абавязкаў можа папоўніцца новымі пунктамі. У канцы тыдня пагрузіцеся ў бесперапынны струмень важных і неадкладных спраў — выбірайце з іх першачарговыя. А ў выхадныя дні можаце раззлавацца на незадаволеныя выразы на тварах блізкіх людзей.

**КАЗЯРОГ.** Трэба стаць дыпламатам па стаўленні да наваколных. Не варта ўрывацца ў іх унутраны свет без запрашэння. У аўторак занадта хуткае выкананне жаданняў павінна насцярожыць: хутчэй за ўсё, яно не абяцае нічога асабліва добрага. Не выключана, што вас проста заваблівають у пастку. Другая палова тыдня можа стаць спрыяльным момантам для збалансавання сямейнага бюджэту: зможаце значна папоўніць фінансавыя запасы.

**ВАДАЛЕЙ.** Паспрабуйце запланаваць справы на тыдзень, каб паспець справіцца з усім неабходным. У панядзелак і аўторак пажадана пазбягаць мітусні. Для вас будуць прывабнымі міжнародныя праекты. Паспрабуйце быць ва ўсім больш уважлівымі і практычнымі. Пажадана не заключаць рызыкоўных здзелак — шанц на поспех практычна роўны нулю.

**РЫБЫ.** Пачатак тыдня давядзецца прысвяціць выкананню шматлікіх абяцанняў, якія вы з лёгкасцю раздавалі раней. У сераду падрыхтуйцеся замяніць рашучасць тактоўнасцю і гатоўнасцю да кампрамісаў. У чацвер не варта раздражняць начальства парушэннямі дысцыпліны або неапраўданымі патрабаваннямі — гэта можа не вельмі добра скончыцца.



**«Звязда»** віншуе з юбілеем беларускага празаіка, свайго былога супрацоўніка, а затым актыўнага аўтара **Валера САНЬКО**. Здароўя і нязменнага аптымізму Вам, паважаны Валер Аляксеевіч, новых знаходак на творчай ніве!

*Жнівень... Падаюць зоркі...*
*Але не загадвай дарэмна,*
*Аніколі свой лёс не асветліш паходняй чужой.*
*Калі падаюць зоркі — гэта значыць:*
*камусьці патрэбна,*
*Каб сцямнелі нябёсы над светлаю хатай тваёй.*

*Прамільгнуць у вышынях*
*і ацiхнуць за вечным пагоркам —*
*Можа, лепшае ёсць, ды не дадзена лёс выбіраць.*
*Хтосьці рукі пагрэе каля дагасаючай зоркі,*
*Хтосьці скажа: «Даруй, што не здолеў*
*цябе ўратаваць».*

*Я у прымхі не веру і падманам сябе не чарую,*
*Ўсё мінала, мінае, і будзе мінаць праз гады...*
*Калі падае зорка, пра адно толькі шчыра шкадую:*
*Што цьмянеюць сузор'і, пра якія спявалі дзяды.*

Фота слова Яўгена ПЯСЕЦКАГА



Дэсерт для дарослых

# ЖАНЧЫНЫ З «ДЫНЯМІ» РЭДКА ЛЮБЯЦЬ СЭКС

**Тэмперамент жанчыны можна вызначыць па форме яе грудзей. Ва ўсялякім выпадку так сцвярджае італьянскі сэксолаг П'ера Ларэнцоні. У інтэрв'ю, змешчаным у нямецкай газеце «Bild», Ларэнцоні заявіў, што жаночы бюст вызначае характар прадстаўніц слабага полу ў значна большай ступені, чым знак задыяка, пад якім нарадзілася тая ці іншая жанчына.**

Класіфікацыя італьянца грунтуецца на падабенстве гэтай выдатнай часткі жаночага цела да розных фруктаў. Пачынаецца «фруктовая карта» з дыні. Як сцвярджае сам аўтар, раней жанчын з вялікімі акруглымі грудзямі, якія па форме нагадвалі дыні, было прынята лічыць схільнымі да мацярынства. Але гэта далёка не так, перакананы сэксолаг: «Насамрэч такія дамы любяць паесці, хочуць, каб іх песцілі, ім падабаецца, калі імі захапляюцца, аднак пры гэтым яны рэдка любяць сэкс».

Мужчынам, якім даспадобы больш актыўныя («жывыя») партнёршы, італьянскі сэксолаг прапануе звярнуць увагу на прыгажунь, чыя форма грудзей нагадвае лімон. Гэта, як правіла, дзёрзкія, яркія жанчыны. «Такія жанчыны напоўнены жыццём і могуць пасмяяцца над сабой. Яны аддаюць перавагу збалансаванаму жыццю, якое не прадугледжвае ніякіх сюрпрызаў».

Шыкоўныя грудзі авальнай формы, пазначаныя ў фруктовай класіфікацыі як ананасы, «раскажуць» дасведчанаму, што іх гаспадыня — разумная, часта кар'ерыстка, але ў душы застаецца рамантычнай натурай. «Такія дамы, як правіла, і самыя верныя, — дзеліцца назіраннямі італьянскі спецыяліст, — але заваяваць сэрца жанчыны-ананаса не проста».

Грудзі тыпу **вінаградзін** (цвёрдыя і выдаюцца ўперад) Ларэнцоні лічыць не вельмі добрай прыкметай для якаснага сэксу. «Такія жанчыны могуць выглядаць эратычна, але насамрэч яны сарамлівыя і цнатлівыя асобы, дамаседкі. Яны могуць ісці насустрач пажаданням і фантазіям партнёра, але аддаюць перавагу не сэксу, а пяшчоце».

Грудзі ў форме **грэйпфрутаў** сведчаць, што жанчына даволі сарамлівая, пяшчотная і ў ложку асаблівага моцнага пачуцця не праявіць. Гэта «хатняя» жанчына, хоць яна можа быць надзелена і пэўнай сэксуальнасцю.

Дамы з грудзямі-**апельсінамі** (цікава, хто акрамя самога Ларэнцоні ў стане адрозніць іх ад грэйпфрутаў?) — таксама не самыя ідэальныя партнёршы для феерычнага сэксу. «Паколькі яны вельмі ўпэўненыя ў сабе і дакладна ведаюць, чаго хочуць, сэкс цікавіць іх менш за ўсё. Ім больш даспадобы размовы і партнёрскія стасункі», — лічыць італьянскі спецыяліст.

Жанчыны з невялікімі грудзямі, якія формай нагадваюць **вішні**, — забаўныя і даволі лёгка ўзбуджальныя. У ложку яны праяўляюць вынаходлівасць і розум. «Яны — выдатныя партнёры для жыцця, але сэкс цікавіць іх не вельмі».

Затое жанчыны, якіх прырода адарыла грудзямі ў форме **груш**, любяць каханне ва ўсіх яго праявах. «Такая жанчына можа быць даволі рэлігійнай, але пры гэтым яна добра ведае, як трэба займацца сэксам», — падсумаваў Ларэнцоні.

Цікавасць да такой прыгожай часткі жаночага цела зразумелая. Грудзі жанчыны — яе краса і гонар. Першыя спробы прадказаць лёс прадстаўніц слабага полу па форме грудзей былі зроблены ў Італіі яшчэ ў XVIII стагоддзі. Гэта цікавая навука нават атрымала сваю назву — сцернамантыя. За шматвяковую гісторыю яе адэпты зрабілі шмат розных тэматычных назіранняў, якія дапоўняць «фруктовую карту» італьянскага сэксолага.

Напрыклад, грудзі, выгнутыя трамплінам, называюць **«лісіны носік»**. Іх гаспадыня — жанчына з нардычным характарам і вострым лагічным розумам. Дамы з «лісіным носікам» вылучаюцца стараннасцю, яны часта становяцца менеджарамі сярэдняга звяна, але вялікіх вышынь у бізнэсе дасягаюць рэдка. Яны лянуюцца праяўляць залішнюю ініцыятыву. Затое ўмеюць прыстасавацца пад любога мужчыну, таму шлюб з «лісічкай», як правіла, удалы. Спецыялісты сцвярджаюць, што ў ложку такія жанчыны вынаходлівыя, раскаваныя, і — верныя.

Сярод жанчын з роўнымі акруглымі грудзямі ў форме яблыка самы вялікі працэнт фрыгіднасці. Давесці такую жанчыну да кульмінацыі — справа працаёмкая і не ўсім па сілах, хоць сама фройляйн-яблык гатовая на ўсё, каб парадаваць каханага. «Яблыкі» вельмі не любяць мяняць сваіх палавых партнёраў, з-за чаго часта бяруцца шлюбам яшчэ ў ранняй маладосці. У сямейным жыцці іх можна ахарактарызаваць як памяркоўных і старанных хатніх гаспадынь.

Цікава, што згаданых у класіфікацыі Ларэнцоні жанчын-**груш** многія спецыялісты лічаць асобамі невялікіх разумовых здольнасцяў. Хоць недахоп інтэлекту зусім не перашкаджае «грушам» вадзіць мужчын за нос. У шлюбе з «грушай» вам гарантаваны дзве рэчы: феерычны сэкс і скандалы ў быце.

**«Козачкі»** — дамы з трохвугольнымі грудзямі здаўна лічыліся самымі тэмпераментнымі і разняволенымі ў сэксе. Для іх не існуе забароненых тэмаў і яны могуць часта мяняць партнёраў. З падобных жанчын атрымліваюцца вялікія тэатральныя актрысы і «зоркі» порна-індустрыі.

Жанчыны-**«баклажаны»** — прыемныя ва ўсіх адносінах. Яны жыццелюбівыя і апантаныя сэксам. Праўда, побач з імі ёсць рызыка стаць «падабцаснікам».

Асобнай увагі заслугоўваюць **сіліконавыя** «фрукты». Дзяўчат з сіліконам знаўцы рэкамендуюць браць з сабой на адпачынак, але ні ў якім разе не раяць на іх жаніцца. У большасці сіліконавых прыгажунь ёсць сур'ёзныя псіхалагічныя праблемы (няўпэўненасць у сабе, страх канкурэнцыі, нарцысізм). Сэкс з такімі «штучкамі» носіць, хутчэй, фармальны, а не эмацыянальны характар.

Дасціпныя мужчыны не абмінулі сваёй увагай такую неад'емную частку жаночых грудзей, як сасок. Натуральны, высокі, ярка выражаны сасок, на іх думку, належыць шчодрым натурам, якія прагнуць улады. Злёгку ўцягнуты і маленькі выдае скрытную, сціплую натуру. Жанчыны з такімі саскамі не бачаць у сэксе нічога асаблівага, але, каб парадаваць партнёра, выканаюць большасць яго фантазій. Ружовыя кругі вакол саскоў з'яўляюцца прыкметай мяккасці, душэўнасці і дабрыні. Цёмныя — палкасці і авантурызму.

Тэарэтычна кожны дарослы мужчына можа скласці сваю асабістую класіфікацыю жаночых прывабнасцяў, абапіраючыся на ўласны вопыт, але ўсё ж надта захапляцца такімі даследаваннямі не раю. Інакш жанчыны адпомсцяць і складуць сваю класіфікацыю (мужчын), напрыклад, плодаагародніную. Памятайце, што мы — гэта не проста сукупнасць пэўных частак цела, і што кожная жанчына, чыім бюстам вы захапляецеся, свята верыць, што вам падабаецца яе душа, сэрца, розум, а не толькі «дынькі» ці «вішанькі».

**Падрыхтавала Іна АРЭХАВА.**



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 4708. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12